Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЛЮТАГА 2022 г. АЎТОРАК № 20 (29642)

ЯК РЫХТУЮЦЬ ВАРТАВЫХ ПРАВАПАРАДКУ? 4

КІТАЙСКІ НОВЫ ГОД: ТРАДЫЦЫІ СВЯТКАВАННЯ 8

Вясёлы пленэр

Зімовая адліга і завея ў мінулыя выхадныя ператварылі сталіцу ў суцэльную крэатыўную пляцоўку. Ужо з раніцы, нібы па камандзе, двары шматпавярховак напоўніліся вясёлым гоманам дзятвы: спорна і дружна, нярэдка разам з бацькамі, малеча пачала творчы «пленэр» па-вырабе снегавікоў. Цяпер гэтыя стыхійныя калектыўныя снежныя выявы красуюцца каля пад'ездаў і пад вокнамі, побач з арэлямі і пясочніцамі, упрыгожваюць, хоць і ненадоўга, дваровую прастору. Як правіла, аўтары недаўгавечных скульптур застаюцца невядомымі, але мне пашанцавала паназіраць за адным з такіх творчых працэсаў і даведацца, як завуць натхнёных мастачак. Далёка хадзіць не прыйшлося: дзяўчынкі жывуць у адным са мною доме (толькі ў розных пад'ездах) і пад самымі вокнамі зладзілі свой зімовы пленэр. Сястрычкі Ганна і Маша БАГДАНАВЫ і іх сяброўка Даша КОРБУТ з дапамогай матуль (якія засталіся па-за кадрам) зляпілі ды размалявалі снежнага коціка. Дзяўчынкі прыдумалі імя свайму канцэптуальнаму твору зусім не выпадкова — Вецярок — і патлумачылі: адмысловыя зялёныя плямкі нагадваюць, што іх герой перахварэў на вятранку.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Іван КРУПКО, старшыня Гомельскага аблвыканкама:

«Гомельская вобласць, як і ў цэлым беларуская эканоміка, па выніках 2021 года паказала нядрэнны вынік: планку 100 працэнтаў пераадолелі — 100,7 працэнта. Сур'ёзны ўклад у рост рэгіянальнай эканомікі ўнесла значная станоўчая дынаміка экспарту тавараў. У папярэднім годзе з тэмпам росту амаль 150 працэнтаў адгружана тавараў больш як на $5 млрд. Задача на бягучы год — дапрацаваць інвестыцыйную праграму вобласці. Акрамя задачы рэгіянальнай палітыкі пабудаваць у кожным раёне па адным-два сярэднія аб'екты ў вытворчай сферы, стаўку ў прыцягненні інвестыцый неабходна рабіць на абласны цэнтр і буйныя гарады. У кожнай галіне, ва ўсіх раёнах вобласці павінна быць сфарміравана дэталёва прапрацаваная інвестыцыйная праграма развіцця з канкрэтнымі бізнес-праектамі».

КАРОТКА

• Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў **Указ № 24 «Аб павышэнні пенсій»**, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы. Дакументам прадугледжваецца перараразлік працоўных пенсій з 1 сакавіка 2022 года ў сувязі з ростам сярэдняй заработнай платы работнікаў у краіне шляхам карэкціроўкі фактычнага заработку пенсіянераў зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у краіне, прыменены пры папярэднім перараразліку пенсій. У выніку перараразліку з 1 сакавіка 2022 года пенсіі павялічацца ў сярэднім на 6,3 працэнта.

ISSN 1990 — 763X

Добрая навіна

З ЛЮТАГА ВЫРАС БЮДЖЭТ ПРАЖЫТАЧНАГА МІНІМУМУ

А разам з ім — дапамогі на дзяцей, даплаты да пенсій і іншыя выплаты

З 1 лютага змяніліся памеры бюджэту пражытачнага мінімуму, а разам з ім выраслі дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, надбаўкі да пенсій асобных катэгорый пенсіянераў, даплаты пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, дапамогі па доглядзе інвалідаў 1-й групы і пенсіянерам, якія дасягнулі 80 гадоў, сацыяльныя пенсіі.

Такім чынам, на перыяд з 1 лютага да 30 красавіка бягучага года бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ўстаноўлены ў памеры 296 рублёў 55 капеек, што на 3 % вышэй у параўнанні з нарматывам, які дзейнічаў з 1 лістапада 2021 да 31 студзеня 2022 года. Для працаздольнага насельніцтва БПМ складае 329 рублёў 35 капеек, для пенсіянераў — 224,10 рубля, для дзяцей да трох гадоў — 187,40 рубля, для дзяцей ад трох да шасці гадоў — 259,47 рубля, для дзяцей ад шасці да 18 гадоў — 317,33 рубля.

СТАР. 7

На слыху

ЗАХВАРАЛЬНАСЦЬ НА COVID-19, ВРІ І ГРЫП ДРУГІ ТЫДЗЕНЬ РАСЦЕ

Медыкі расказалі, калі лепш прыходзіць у паліклініку, як зрабіць тэст і колькі цяпер доўжацца бальнічныя

У Беларусі, як і ў краінах-суседках, ужо 1,5 тыдня рэгіструецца рост захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі, грып і каранавірусную інфекцыю. Раніцай у панядзелак, 31 студзеня, у многіх гарадскіх паліклініках утварыліся чэргі. Пацыенты скардзяцца на высокую тэмпературу, кашаль, болі ў горле, мышачную слабасць, датэлефанавацца ў медустановы складана. Як арганізавана работа паліклінік і ці дастаткова ўрачоў для прыёму пацыентаў? Колькі ложкаў у стацыянарах перапрафілявана для хворых на каранавірусную інфекцыю? Наколькі цяжка хварэюць дзеці? На гэтыя і іншыя пытанні адказалі спецыялісты Міністэрства аховы здароўя.

СТАР. 7

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У НАС УСЕ МАГЧЫМАСЦІ ЁСЦЬ, КАБ ВЫКОНВАЦЬ АБАВЯЗКІ І ПАРАМЕТРЫ»

З дакладам у кіраўніка краіны ўчора быў старшыня праўлення Нацбанка

Выкананне прагнозу сацэканамразвіцця і грашова-крэдытнай палітыкі, падтрымка экспарцёраў, стрымліванне інфляцыі — асноўныя тэмы, якія абмеркаваў Аляксандр Лукашэнка з Паўлам Калаурам і са сваім памочнікам Валерыем Бельскім.

Пытанні фінансаў, адзначыў Прэзідэнт, публічна не абмяркоўвалі ўжо доўгі час: «Гэта правільна: грошы любяць, як вы, банкіры, заўсёды падкрэсліваеце, цішыню. І сённяшняя наша размова абсалютна не звязаная з нейкімі праблемамі — абсалютна наадварот. У мінулым годзе вы малайцы, спрацавала нядрэнна ўся банкаўская сістэма».

Але, падкрэслівае кіраўнік краіны, заслуга тут не толькі банкаўскай сферы — добра працаваў увесь эканамічны блок краіны. Прафіцыт знешняга гандлю склаў амаль чатыры мільярды долараў.

«У нас усе магчымасці ёсць і ў гэтым годзе, каб выконваць абавязкі, што ўзялі, і параметры, што былі вызначаныя Усебеларускім народным сходам і канкрэтызаваныя намі. На гэты год мы ж свядома іх прымалі — рост эканомікі. Я вам гарантую, што ніякага залішняга ціску не будзе ні на вас, ні на памочніка, што займаецца гэтымі пытаннямі, ні на ўрад», — паабяцаў Прэзідэнт.

Але пры гэтым ён публічна папярэдзіў Нацбанк і ўрад: тыя паказчыкі, што намецілі (належны ўзровень ВУП, стабільнасць, узровень жыцця насельніцтва), — гэта святое.

«Не дай Бог, гэта не будзе выканана. Галоўнае, як вы толькі што прызналі, — эканоміка. Усё астатняе — другаснае», — заяўляе Аляксандр Лукашэнка.

Усе «рычагі» для прыняцця мер у эканоміцы былі перададзены старшыні Нацбанка яшчэ пры назначэнні, таму ён сярод першых у краіне адказвае за «здароўе» сферы.

«Прымайце любыя меры. Я ж так сказаў і ў сферы аховы здароўя: «Што хочаце рабіце ў ахове здароўя: лячыце, не лячыце, мацайце, гладзьце, рэжце, але захавайце жыцці людзей. Так жа і вам у эканоміцы: вы, Галоўчанка (Раман, прэм'ер-міністр. — **«Зв.»**) і падначаленыя вам структуры — кантроль за вамі», — дадае Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны адзначае, што неабходныя паказчыкі ў эканоміцы (узровень інфляцыі, ВУП і іншыя) вызначаны, і яны павінны выконвацца.

«Усялякія спрэчкі, Валерый Іванавіч (Бельскі, памочнік Прэзідэнта. — **«Зв.»**) наконт таго, колькі ў нас грашовай масы, які курс рубля і іншыя — гэта да ўрада. Вось два кіты (кіраўнікі ўрада і Нацбанка. — **«Зв.»**), вы трэці, садзіцеся абмяркоўвайце меры, але жалезабетонна павінна быць выканана», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да свайго памочніка.

Прэзідэнт патлумачыў, чаму так жорстка ставіць пытанне: у працэсе працы размоў шмат, а на фінішы пачынаюцца пошукі апраўданняў.

«Таму не столькі пра сітуацыю на фінансавым рынку хацелася б пачуць (але і гэта не выключаю), а як будзе працаваць эканоміка. Усё астатняе нам вядома. Калі ёсць іншыя пытанні, звязаныя з санкцыйным ціскам (вам таксама прыходзіцца яго трымаць), я думаю, вы пра гэта скажаце», — арыентаваў кіраўнік краіны на размову.

Марыя ДАДАЛКА.

У тэму

Інфляцыя. Па словах Паўла Калаура, урад і Нацбанк, праводзячы сваю эканамічную палітыку, першачарговую ўвагу будзе ўдзяляць інфляцыі. «Задачы — забеспячэнне цэнавай стабільнасці, да канца года імкнуцца да інфляцыі ў шэсць працэнтаў. Гэта няпростыя праблемы, паколькі яны абумоўлены так званай імпартаванай інфляцыяй. І ўсе нашы суседзі перажываюць непрыемны перыяд высокай інфляцыі», — адзначае старшыня праўлення Нацбанка, акцэнтуючы: свет чакае зніжэння інфляцыі ў канцы года. Прагназуе спецыяліст у першым квартале ў плане інфляцыі своеасаблівае плато з нязначнымі адхіленнямі да ўзроўню, што маем сёння.

Стаўка рэфінансавання. Старшыня праўлення Нацыянальнага банка заяўляе: ужо многія гады забяспечваецца рэальная працэнтная стаўка на грашовых рынках. «Мы будзем назіраць за сітуацыяй, не робячы паспешных крокаў. Калі трэнд па інфляцыі, што прагназуем, матэрыялізуецца, то запланаваная стаўка рэфінансавання ў межах 9-10 працэнтаў так і застанецца», — патлумачыў Павел Калаур.

Падтрымка экспарцёраў. Суразмоўца ўпэўнены: іх падтрымліваць неабходна заўсёды, але крэдыты павінны быць рыначнымі. «Калі мы хочам падтрымаць пэўны кірунак экспарту, дзейнічаюць пэўныя праграмы з банкаўскай супольнасцю. Калі гэтыя праграмы незапатрабаваныя, дапускаем, што могуць быць і дадатковыя мерапрыемствы па льготаванні працэнтных ставак. Але льготаванне ставак ідзе за кошт бюджэту», — акцэнтаваў Павел Калаур.

Стаўкі па дэпазітах. Павел Калаур адзначае, што на гэтым рынку сітуацыя станоўчая, назіраецца прырост на 1,5 % укладаў у нацвалюце і ў замежны валюце. Аднак павышэнне ставак чакаць не варта. «Калі сітуацыя з інфляцыяй будзе, як я апісаў, то павышэння працэнтных ставак па дэпазітах не чакаецца», — прагназуе эксперт.

«МЫ ГАТОВЫ ДА ТАГО, КАБ ДАМАЎЛЯЦЦА»

Санкцыйная палітыка Захаду — тэма другой рабочай сустрэчы Прэзідэнта ў панядзелак

Кіраўнік краіны запланаваў цэлую серыю сустрэч з прадстаўнікамі кампаній розных галін эканомікі, што трапілі пад санкцыі. Адкрылі шэраг абмеркаванняў генеральныя дырэктары Беларускай калійнай кампаніі Алена Кудравец і «Беларуськалія» Іван Галавацы. Прысутнічаў на сустрэчы прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка.

«Сутнасць нашай сённяшняй размовы — санкцыйная палітыка Захаду. Прайшоў пэўны час, і вас я папярэджваў, што пытанні супрацьстаяння санкцыйнай палітыцы — гэта пытанні ўрада, але з Прэзідэнта кантроль ніхто не здымаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заўважыў, што ў гэты перыяд банкі працуюць стабільна, і пахваліў папярэдніх суразмоўцаў — Паўла Калаура і Валерыя Бельскага.

«Далей я хацеў бы паслухаць, якая сітуацыя ў сувязі з гэтымі санкцыямі ў асноўных нашых кампаній, што трапілі пад санкцыі, у тым ліку і Беларуская калійная кампанія, і «Беларуськалій». Потым «Белавія». Пасля справаздачы ІСАО не ведаю, па якой прычыне ціснуць на яе цяпер», — заўважыў Прэзідэнт.

Мяркуе кіраўнік краіны сустрэцца з прадстаўнікамі нафтапрамысловага, нафтахімічнага комплексу і папярэджвае, каб спецыялісты, міністры былі гатовыя далажыць аб рабоце ў санкцыйны перыяд.

Па словах Прэзідэнта, прадпрыемствы знайшлі вартыя шляхі пераадолення праблем санкцый. «Назіраючы па мінулым годзе, знойдзены добрыя альтэрнатывы на многіх прадпрыемствах. Нядрэнна і «Беларуськалій» спрацаваў. Але, тым не менш, неабходна глядзець наперад. Калі, напрыклад, Літва не хоча прапускаць нашы грузы ў порт і перавальваць іх у порце — добра. Гэта іх права. Калі так адбудзецца, Раман Аляксандравіч, значыць, на працягу некалькіх дзён павінны быць рэалізаваны мерапрыемствы, аб якіх мы дамаўляліся ў адносінах Літвы», — даручыў Аляксандр Лукашэнка прэм'ер-міністру.

Паводле яго слоў, Беларусь не ініцыіруе працэсаў, што могуць прывесці да абвастрэння канфлікту з Літвой, Латвіяй, Польшчай ці Украінай. «Я ж сказаў у пятніцу — мяне мала хвалюе: хочуць яны захаваць твар, не захаваць твар — няхай выходзяць і дамаўляюцца. Мы гатовы да таго, каб дамаўляцца. Калі і далей будуць ціснуць, дзейнічаем па тым плане, які ёсць. Няхай потым не скардзяцца. А народы краін павінны разумець: мы проста адказваем на гэтыя выклікі», — заявіў беларускі Прэзідэнт.

Ён яшчэ раз нагадаў, што на сустрэчы разгледзяць пастаўкі калійных угнаенняў, абмінаючы традыцыйныя парты. Далей падрыхтавацца да сустрэчы сказана «Белавія» і іншым буйным кампаніям, якія трапілі пад санкцыі.

Марыя ДАДАЛКА.

У цэнтры ўвагі

Кодэкс аб адукацыі: што трэба мець на ўвазе

Прэзідэнт падпісаў закон, які зацвярджае новую рэдакцыю Кодэкса аб адукацыі

У абноўленай рэдакцыі, у прыватнасці, прапаноўваецца іншае вызначэнне самой адукацыі. Яе мэтай становіцца не толькі рознабаковае развіццё асобы навучэнца, але і фарміраванне ў яго кампетэнцый. Агульная сярэдняя адукацыя становіцца абавязковай: яе можна атрымаць не толькі ў агульнаадукацыйных установах, але і ў сістэме прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама ў вячэрніх класах або ў парадку экстэрнату.

ШКОЛА

Прадугледжваецца правядзенне выніковай атэстацыі пасля завяршэння агульнай сярэдняй адукацыі па асобных вучэбных прадметах у выглядзе цэнтралізаванага экзамену. Парадак яго правядзення будзе зацверджаны Міністэрствам адукацыі.

У Кодэксе замацавана нарматыўнае фінансаванне дзяржаўных устаноў адукацыі, якое паказала падчас эксперыментаў сваю эфектыўнасць.

Для ўпарадкавання работы прыватных устаноў дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі закладзена магчымасць фінансаванням часткі расходаў такіх устаноў за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў у парадку, які вызначаецца ўрадам.

У мэтах выключэння ўвядзення ў зман насельніцтва Кодэксам прадугледжаны забарона на выкарыстанне ў найменнях юрыдычных асоб, якія не з'яўляюцца ўстановамі адукацыі, назваў «дзіцячы сад», «школа», «гімназія», «ліцэй», «вучылішча», «каледж», «універсітэт», «інстытут», «акадэмія», калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

З'яўляецца новы від дадатковай адукацыі — для адораных дзяцей і моладзі на базе Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка.

ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ

У абноўленым Кодэксе змены закранулі і патрабаванні да ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Так, прадугледжваецца спыненне адукацыйных адносін з навучэнцамі, якія прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за аднаразовае ўчыненне грубага адміністрацыйнага правапарушэння або прыцягнуты да крымінальнай адказнасці.

У праект уведзена паняцце «канфлікт інтарэсаў педагагічнага работніка». Пад ім маецца на ўвазе сітуацыя, калі ў педагога ўзнікае зацікаўленасць у атрыманні якой-небудзь выгады, што супярэчыць інтарэсам навучэнцаў або іх бацькоў. Напрыклад, на ўроку настаўнік павярхоўна патлумачыў матэрыял і вучань не засвоіў тэму. Замест таго, каб арганізаваць працэс з дапамогай падтрымліваючых заняткаў, настаўнік прапаноўвае свае паслугі ўжо ў якасці рэпетытара.

Новая рэдакцыя Кодэкса пазбаўлена залішняй дэталізацыі. Напрыклад, шкала адзнак, самі адзнакі і запісы, якія выкарыстоўваюцца для ацэньвання вучобы, будуць устанаўлівацца не Кодэксам, а Правіламі правядзення атэстацыі. Гэта дазволіць пры неабходнасці хутка ўнесці змены не ў Кодэкс, што дастаткова складана і займае шмат часу, а непасрэдна ў Правілы.

Перададзены паўнамоцтвы мясцовым выканаўчым і распарадчым органам і іншым заснавальнікам па ўстанаўленні або змяненні норм напаўняльнасці груп і класаў.

ПРАФЕСІЙНАЯ АДУКАЦЫЯ

У новым Кодэксе прадугледжваецца скарачэнне тэрміну атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Так, на аснове агульнай сярэдняй адукацыі ў дзённай форме ён складзе ад шасці месяцаў да аднаго года (цяпер — ад года да двух гадоў).

Уводзіцца адзінае найменне ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі — каледж.

Застаюцца тры віды ВНУ: інстытут, акадэмія (кансерваторыя), універсітэт.

Навацыяй з'яўляецца магчымасць рэалізацыі адукацыйных праграм у сеткавай форме шляхам узаемадзеяння ўстаноў адукацыі паміж сабой і з іншымі арганізацыямі з выкарыстаннем іх рэсурсаў і матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Прадугледжваецца развіццё дыстанцыйнай формы як самастойнай формы атрымання адукацыі. Раней яна была ўсяго толькі разнавіднасцю завочнай.

Асаблівая ўвага ў Кодэксе ўдзяляецца сацыяльнай абароне навучэнцаў і выпускнікоў. Дзеючыя нормы дапоўнены. Так, выпускнікі, якія навучаліся на платнай аснове і звярнуліся па накіраванне на работу, будуць атрымліваць статус маладога спецыяліста.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАБ НІКОЛІ БОЛЬШ...

Работа па ўвекавечанні памяці ахвяр генацыду беларускага народа, па папярэджанні фактаў рэабілітацыі і гераізацыі нацызму вядзецца па ўсіх кірунках

Шырокі рэзананс падчас грамадскіх абмеркаванняў праекта змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі атрымалі новаўвядзенні, звязаныя з захаваннем гістарычнай памяці аб подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Як ужо выказаліся многія эксперты, новае палажэнне прадугледжвае не толькі тое, што мы, нашчадкі народа-пераможцы, ніколі не павінны забываць аб тых трагічных і гераічных падзеях, якія адбываліся на нашай зямлі сем і больш дзесяцігоддзяў таму, — гэтая навацыя ў Асноўным Законе краіны сведчыць яшчэ і аб тым, што мы не павінны дапускаць ніякіх фальсіфікацый на дадзеную тэму, а кожны, хто будзе падаваць гісторыю пад выгадным яму ракурсам, панясе адказнасць.

Гэты пастулат замацаваны яшчэ ў адным важным дакументе. У пачатку года Прэзідэнтам краіны быў падпісаны Закон «Аб генацыдзе беларускага народа». З прыняццем гэтага закона цікавасць да праблематыкі не знікла, а нават узмацнілася. Цяпер аб недапушчэнні скажэння вынікаў Другой сусветнай вайны, перапісвання гістарычных фактаў, захоўванні памяці аб мінулых падзеях і іх увекавечанні будуць абавязаны клапаціцца не толькі гісторыкі, музейныя супрацоўнікі і іншыя неабыякавыя да мінулага людзі, але і ўсе мы, хто беларусамі завецца.

ПРАЯЎЛЕННЕ НАЦЫЗМУ Ў XX СТАГОДДЗІ

— Хачу нагадаць словы генеральнага пракурора, што расследаванне справы аб генацыдзе — гэта работа не толькі крымінальна-прававога характару, — акцэнтаваў увагу **кіраўнік следчай групы па расследаванні крымінальнай справы аб генацыдзе — начальнік упраўлення Генеральнай пракуратуры Валерый ТАЎКАЧОЎ**. — Разам з папярэднім расследаваннем следствам вядзецца планамерная і маштабная дзейнасць па ўсіх кірунках: ідэалагічным, інфармацыйным, заканатворчым. З самага пачатку работы па крымінальнай справе мы аператыўна рэагуем на неабходнасць заканадаўчых змяненняў, актыўна ўдзельнічаем у рэалізацыі прынцыпу галоснасці, выступаем ініцыятарамі комплекснага межведамаснага ўзаемадзеяння па гэтых пытаннях.

Як заўважыў прадстаўнік Генпракуратуры, Беларусь — першая краіна, якая здолела скансалідавацца, даць адпор і супрацьстаяць спробе дзяржаўнага перавароту ў 2020 годзе. «Каб не дапусціць паўтору гэтага сцэнарыя, намі былі вывучаны прычыны і ўмовы, якія садзейнічалі злачынным дзеянням, — адзначыў Валерый Таўкачоў. — Фактычна мы ўбачылі, што арганізатары, натхняльнікі дэстабілізацыі і звяржэння ўлады — гэта ў большасці сваёй палітычныя эліты дзяржаў, адкуль да нас у XX стагоддзі прыйшоў фашызм. Пры актыўным удзеле Генеральнай пракуратуры распрацаваны даведачна-аналітычныя матэрыялы аб генацыдзе беларускага народа ў часы Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд, а таксама выкарыстанні нацысцкай ідэалогіі ўдзельнікамі спробы дзяржаўнага перавароту ў 2020 годзе на тэрыторыі нашай краіны. У матэрыялах паказаны планы нацысцкай Германіі па ажыццяўленні генацыду, дзейнасць калабаранцкіх і нацыяналістычных фарміраванняў, адлюстравана жудасная сувязь часоў, калі ў 2020 годзе Рэспубліка Беларусь зноў сутыкнулася з праяўленнямі экстрэмізму і тэрарызму пад нацысцкай сімволікай. Відавочна, што за апошнія 80 гадоў нічога не памянялася. Тыя падыходы, якія выкарыстоўваліся ў XX стагоддзі, падчас Вялікай Айчыннай вайны, дэструктыўныя сілы выкарыстоўваюць і цяпер».

ГЕНАЦЫД У КАНТЭКСЦЕ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ

Расследаванне крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа, заведзенай Генеральнай пракуратурай, працягваецца. У ходзе следства ўстанаўліваюцца новыя факты злачынстваў фашыстаў і іх памагатых у дачыненні да беларускага народа, выяўляюцца невядомыя дагэтуль месцы масавага знішчэння чырвонаармейцаў, партызан, мірных жыхароў. Знойдзеныя падчас раскопак прадметы ведамства перадаюцца ў музейныя ўстановы, дзе ствараюцца экспазіцыі аб ахвярах генацыду.

— Лічбы і звесткі аб шкодзе ад дзеянняў нацысцкіх злачынцаў, якія былі ўстаноўлены пасля вайны, значна ніжэйшыя за рэальную шкоду, — паведаміў Валерый Таўкачоў. — Ніхто ў той час не пралічваў і не ўстанаўліваў, якія нашы страты ў выніку панесеных дэмаграфічных страт. Менавіта таму была створана межведамасная працоўная група, работа якой дазволіць ацаніць рэальную шкоду, прычыненую народнай гаспадарцы краіны нацысцкімі злачынцамі і іх памагатымі, у выніку чаго камісія запатрабуе ва ўстаноўленым парадку яе кампенсацыі. Адначасова з гэтым пад кіраўніцтвам Міністэрства культуры актывізавана дзейнасць камісіі па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны абарот культурных каштоўнасцяў, вывезеных за межы Беларусі.

Акрамя таго, Генпракуратура ініцыявала стварэнне адзінага мемарыяльнага комплексу ахвяр генацыду ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Таксама плануецца распрацаваць адметны памятны знак ахвяр генацыду. Рыхтуецца ўнясенне інфармацыі аб ахвярах генацыду ў адзіную кнігу памяці Рэспублікі Беларусь.

Па словах Валерыя Таўкачова, Генеральная пракуратура ва ўзаемадзеянні з іншымі дзяржорганамі і арганізацыямі працягне комплексную работу ў межах расследавання справы аб генацыдзе. «Гэта дазваляе супрацьдзейнічаць агрэсіўнаму ціску, перш за ўсё, на наша маладое падрастаючае пакаленне, якое вырасла ў мірны, спакойны і добры час», — падкрэсліў ён.

АГУЛЬНЫМІ НАМАГАННЯМІ

Да расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе падключыліся многія ведамствы, проста неабыякавыя да нашага мінулага людзі. Усебаковае садзейнічанне ходу расследавання па атрыманні матэрыялаў аказваюць супрацоўнікі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук.

— Узбуджэнне гэтай крымінальнай справы значна актывізавала навукова-даследчую дзейнасць нашых супрацоўнікаў у галіне вывучэння пытанняў Вялікай Айчыннай, Другой сусветнай вайны, а таксама пасляваеннага перыяду, — расказаў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Станіслаў ЮРЭЦКІ**. — У дзейнасці Інстытута гісторыі знакавым таксама з'яўляецца той факт, што 2022 год аб'яўлены ў нашай краіне Годам гістарычнай памяці. У гэтай сувязі намі падрыхтаваны прапановы па правядзенні больш чым дзесяці навуковых канферэнцый як у Мінску, так і ў рэгіёнах нашай краіны. Нядаўна Нацыянальная акадэмія навук аб'явіла рэспубліканскі конкурс творчых работ, прысвечаных Году гістарычнай памяці. Работы на конкурс прымаюцца ў якасці навуковых даследаванняў, публіцыстыкі, эсэ, успамінаў, прозы і паэзіі.

У сувязі з заведзенай крымінальнай справай актывізавалі сваю дзейнасць і музейныя ўстановы краіны. Як канстатаваў **вучоны сакратар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Валерый НАДТАЧАЕЎ**, Вялікую Айчынную вайну спрабуюць схаваць у Другую сусветную для таго, каб развеяць значэнне і нашай Вялікай Перамогі, і ўклад народаў Савецкага Саюза ў гэтую вайну, падмяніць ключавыя падзеі абаронай вострава Мідуэй і іншымі малазнакавымі аперацыямі ў Паўночай Афрыцы. «Гэта тое, што кідаецца ў вочы, калі мы працуем з наведвальнікамі: а гэта звыш ста краін, прадстаўнікі якіх наведвалі наш музей, — удакладніў Валерый Надтачаеў. — І кожны прыходзіць са сваёй праўдай, са сваімі ведамі або няведаннем гэтага перыяду гісторыі».

Па словах Валерыя Надтачаева, пасля вайны было вельмі шмат тэм, якія патрэбна было вучоным распрацоўваць. «Ствараліся працы, прысвечаныя подзвігу беларускага народа: на той момант гэта было важна і палітычна апраўдана, — заўважыў ён. — Улічваючы, што быў сацыялістычны лагер, мы зрабілі выгляд, што нашы калегі па сацыялістычнай садружнасці калі і ўдзельнічалі ў генацыдзе, то нязначна. А, між іншым, тыя ж венгерскія ўзброеныя сілы, якія тут дыслакаваліся, прайшлі з агнём і мячом па Брэсцкай вобласці. Не згадвалі французаў, а паказвалі толькі «Нармандыю-Неман». Там, вядома, былі героі, але настолькі мала ў параўнанні з французскім легіёнам, які і Маскву штурмаваў, і ў Беларусі адзначыўся ў карных аперацыях. Дадзеныя факты таксама хавалі, як і многія іншыя моманты. Сёння гэта пераасэнсоўваецца. Замежныя наведвальнікі, якія бываюць у нашым музеі, прызнаюць толькі Халакост. Генацыд беларускага народа яны не вельмі разумеюць, а дакладней, спрабуюць гэтую тэму не ўзнімаць, кажучы аб тым, што знішчаліся памагатыя партызан».

— Найважнейшай палітычнай падзеяй стане рэспубліканскі рэферэндум, і, несумненна, пераважная колькасць грамадзян падтрымае змяненні і дапаўненні, якія ўнесены, у тым ліку палажэнне ў 15-м артыкуле, якое сведчыць, што дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — пераканаў **прафесар кафедры ідэалагічнай работы і сацыяльных навук Ваеннай акадэміі Уладзімір МАКАРАЎ**. — Падтрымаюць людзі і артыкул № 54, які дапаўняецца палажэннем, якое сведчыць, што захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа, патрыятызм з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Вераніка КАНЮТА.

МЕРКАВАННЕ

На варце мірнага суіснавання ўсіх краін

Наталля ТАРАСЕНКА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

— У інфармацыйнай прасторы ўсё часцей з'яўляюцца нагоды, якія прымушаюць задумацца аб нетрывалаасці міру. Абстаноўка ў еўрапейскім рэгіёне з кожным днём абвастраецца. Вельмі нагнятае трывогу і сее паніку сярод еўрапейскай грамадскасці фэйк, які распаўсюджваецца ЗША, аб нападзе Расіі на Украіну. Разглядаецца рэальная магчымасць узброенага канфлікту, развязвання новай вайны на зямлі, якая да гэтага часу не акрыяла ад папярэдняй — Вялікай Айчыннай. Гэтая тэма была прааналізавана кіраўніком дзяржавы ў пасланні беларускаму народу і парламенту адной з першых. Ён сказаў, што прымусіць беларускі народ удзельнічаць у ваенных дзеяннях можна толькі ў двух выпадках — прамога нападзення на Рэспубліку Беларусь або агрэсіі супраць Расіі, з якой у нас агульная граніца ў рамках Саюзнай дзяржавы.

Але каму патрэбная новая вайна? Рускім, беларусам, палякам, украінцам? Якая маці марыць адправіць на смяротны бой свайго сына? Які наогул народ згодны на ўласнае знішчэнне? Але ёсць тыя, каму выгадна выстаўляць Беларусь і Расію краінамі-агрэсарамі. Грамадская думка жыхароў краін Еўрасаюза і ЗША мэтанакіравана фарміруецца такім чынам, каб апраўдаць перамяшчэнне войскаў НАТА да граніц нашых дзяржаў, перакідку зброі (прычым наступальнай), нарошчванне фінансавання ўзброеных сіл сумежных з намі дзяржаў. Каму патрэбная вайна? Каму гэта выгадна? Хто пацерпіць ад яе развязвання? Адказы ляжаць на паверхні...

Зусім хутка адбудзецца агульнанацыянальны рэферэндум, дзе кожны з нас выкажа сваё меркаванне аб будучыні Радзімы. Цяпер у грамадстве ідзе вельмі важная, карпатлівая і ўдумлівая работа па абнаўленні Асноўнага Закона беларускай дзяржавы. Канстытуцыя павінна адпавядаць рэаліям часу, улічваць інтарэсы ўсіх грамадзян, працаваць на перспектыву. Канстытуцыя ў новай яе рэдакцыі накіравана ў будучыню і найважнейшы яе пасыл закладзены ва ўмацаванні адзінства народа, захаванні нацыянальнай самабытнасці і суверэнітэту, міру і стабільнасці як асновы развіцця беларускага грамадства, магчымасці рэалізацыі правоў і свабод кожнага грамадзяніна Беларусі.

У артыкуле 18 новай рэдакцыі Канстытуцыі замацоўваецца статус Беларусі як дзяржавы-міратворца. Тэзіс пра тое, што Рэспубліка Беларусь выключае ваенную агрэсію ў адносінах да іншых дзяржаў, яшчэ раз падкрэслівае міралюбівы характар знешняй палітыкі нашай дзяржавы, якая стаіць на варце мірнага суіснавання ўсіх краін, блізкіх і далёкіх.

Прайшоўшы праз жахі Вялікай Айчыннай вайны, страціўшы кожнага трэцяга свайго жыхара, ведаючы, што такое голад і холад, мы разумеем, што ў вайне выйграе толькі той, для каго яна бізнес, усяго толькі спосаб атрымання грошай на крыві і болі дзяцей і старых. Беларусь была, ёсць і застаецца мірнай краінай. Мы ніколі нікому не пагражалі кровапраліццем і забойствам. Назаўжды ў памяці народнай будзе жыць адмаўленне вайны як спосабу вырашэння любых канфліктаў. Таму беларускі народ і беларуская дзяржава заўсёды выступаюць гарантам і донарам міру і стабільнасці, ствараюць усе неабходныя ўмовы для вырашэння самых вострых пытанняў выключна мірным шляхам.

Каб пачаўся пажар, дастатковa адной запалкі. Народы былога Савецкага Саюза, перажыўшы нечалавечыя выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны, атрымалі назаўжды гістарычны апёк, які стрымлівае ўсіх нас ад кроку ў бездань. Азірніцеся, хто штурхае нас у спіну? Каму не важна, як будуць жыць нашы дзеці і ўнукі? Няўжо народам, якіх спрабуюць уцягнуць у канфлікт, не хопіць розуму і цвёрдасці духу, каб спыніць махавік смерці, які ўпарта спрабуюць раскруціць нашы нядобразычліўцы? У нас ёсць наша зямля і мы зробім усё неабходнае для таго, каб жыццё на ёй было шчаслівым. І абараніць родную зямлю, яе граніцы ў выпадку чаго мы таксама здолеем.

Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY

ШКОЛА ГОНАРУ І ГОДНАСЦІ

Карэспандэнты «Звязды» высвятлялі, як рыхтуюць вартавых правапарадку

Сёння роўна год, як Цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Міністэрства ўнутраных спраў, які вядзе свой летапіс з 1954 года, функцыянуе ў новым статусе. 1 лютага 2021 года ў выніку маштабнай рэарганізацыі ён быў аб'яднаны з Цэнтрам павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Дэпартамента аховы. Сёння гэта сучасная навучальная ўстанова, якая рыхтуе высокакваліфікаваныя кадры не толькі для органаў унутраных спраў, але і для іншых сілавых структур краіны.

НАВУЧАННЕ З КАМФОРТАМ

Тэрыторыя Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС, які знаходзіцца ў Мінскім раёне, вялікая. Яе ўпрыгажэнне — новы вучэбна-адміністрацыйны корпус, урачыстае адкрыццё якога адбылося 2 верасня. Сучасныя аўдыторыі, дзве лекцыйныя залы на 240 пасадачных месцаў кожная, шэсць камп'ютарных класаў, агульная і спецыяльная бібліятэкі — усё разлічана на тое, каб навучанне ў цэнтры праходзіла ў максімальна камфортных умовах. Заняткі з практычным ухілам праводзяцца ў класах крыміналістыкі, медыцынскай падрыхтоўкі, спецтэхнікі, тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі. Не забываюцца тут і пра тое, што будучыя вартавыя правапарадку павінны быць яшчэ і ў добрай фізічнай форме: у цэнтры функцыянуюць сучасныя залы барацьбы, трэнажорная зала, заняткі па агульнафізічнай падрыхтоўцы праходзяць на стадыёне са спецыяльным пакрыццём. На абсталяваных стрэльбішчах курсанты вучацца валодаць зброяй.

Жывуць будучыя праваахоўнікі ў камфортных інтэрнатах (у цяперашні час ідзе будаўніцтва яшчэ аднаго), харчуюцца ў сталовай, якая займае асобны будынак. На тэрыторыі функцыянуе і кіналагічны цэнтр, дзе ажыццяўляюць перашапачатковую падрыхтоўку, а таксама павышаюць кваліфікацыю спецыялісты-кінолагі. Ёсць свая царква, дзе рэгулярна адбываюцца богаслужэнні.

— З дня рэарганізацыі цэнтра і яго перадыслакацыі прайшоў год, — адзначае **начальнік Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС палкоўнік міліцыі Аляксандр МАШКІН.** — Адрэзак зусім невялікі, але кіраўніцтвам і супрацоўнікамі за гэты час зроблена нямала. Падабраны кваліфікаваны кадравы састаў, які валодае вопытам практычнай работы ў органах унутраных спраў і перадае яго новаму пакаленню супрацоўнікаў аховы правапарадку. За мінулы год па шматлікіх праграмах адукацыю атрымала звыш трох тысяч чалавек, у тым ліку каля дзвюх тысяч курсантаў, якія прайшлі першапачатковую падрыхтоўку і ўжо служаць у розных падраздзяленнях МУС.

КУРСАНЦКІЯ БУДНІ

У Цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС атрымліваюць адукацыю тры катэгорыі навучэнцаў. Павышаюць сваю кваліфікацыю ўжо дзеючыя супрацоўнікі органаў унутраных спраў, а таксама іншых сілавых структур. Першапачатковую падрыхтоўку праходзяць грамадзянскія асобы, якія плануюць звязаць свой лёс з праваахоўнымі органамі. Акрамя таго, наладжаны навучальныя курсы, курсы павышэння кваліфікацыі, перападрыхтоўкі па праграмах рознага профілю як для прадстаўнікоў сілавога блока, так і для грамадзянскіх асоб.

У залежнасці ад таго, якія пасады ў перспектыве курсанты зойміуць, столькі часу яны правядуць у цэнтры. Будучыя супрацоўнікі Дэпартамента аховы або ўпраўленняў унутраных спраў вучацца 14 тыдняў. У тых, хто будзе служыць у Дэпартаменце выканання пакаранняў, тэрмін навучання на два тыдні меншы.

Каб трапіць у цэнтр, аднаго жадання недастаткова. Папярэдні адбор кандыдаты ў курсанты праходзяць у камплектуючых падраздзяленнях. Канчатковы, які ўключае ў сябе праверку фізічнай падрыхтоўкі, чакае іх у цэнтры. Тыя шчасліўчыкі, якія надзелі курсанцкія пагоны, ужо з першага дня навучання ў цэнтры становяцца супрацоўнікамі органаў унутраных спраў.

— У курсантаў, якія да нас прыходзяць, ужо ў першы тыдзень знаходжання тут пачынаецца новае жыццё, — заўважае **начальнік аддзялення планавання адукацыйнага працэсу Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС падпалкоўнік міліцыі Аксана ГРУШЭВІЧ.** — Яно кардынальна адрозніваецца ад таго, якое было на грамадзянцы. Маладыя людзі актыўна займаюцца фізічнай падрыхтоўкай, акрамя таго, яны пачынаюць несці службу ў нарадах. Выносівасць тут павінна быць на першым месцы.

Увесь перыяд, пакуль ідзе адукацыйны працэс, курсанты знаходзяцца на тэрыторыі цэнтра кругласутачна. Тут яны жывуць, вучацца, праводзяць вольны час. Хоць апошні, вядома, у дэфіцыце. Прадугледжаны звальненні, падчас якіх навучэнцы выходзяць за тэрыторыю цэнтра. Аднак бывае гэта нячаста і ў выключных выпадках. Большасць навучэнцаў упершыню пакідае навучальную ўстанову ўжо з пасведчаннем аб яе паспяховым заканчэнні.

Курсант Кацярына Ласевіч ужо на працягу пяці гадоў працуе ў органах унутраных спраў Брэста як неатэставаны супрацоўнік. Дзяўчына марыць стаць афіцэрам, дзеля гэтага апынулася ў цэнтры. «Вучыцца тут зусім не складана, — прызнаецца Кацярына. — Так, ёсць пэўныя побытавыя абмежаванні, але гэта часова. Магчыма, іх наўмысна і ствараюць, каб праверыць, як будучы супрацоўнік праваахоўных органаў будзе весці сябе ў той ці іншай сітуацыі. Да дзяўчат — такое ж стаўленне, як і да курсантаў-хлопцаў. Ніякіх патуранняў! Мы ўсе — будучыя супрацоўнікі МУС, а значыць, нароўні павінны выконваць пастаўленыя задачы».

З УХІЛАМ НА ПРАКТЫКУ

Паколькі тэрмін навучання ў Цэнтры даволі кароткі, рыхтуюць курсантаў ва ўмовах, набліжаных да рэальных. Прыкладна 65 % ад усіх заняткаў — з практычным ухілам. Тактыка-спецыяльная падрыхтоўка ажыццяўляецца па профілях: ідзе падзел курсантаў на будучых супрацоўнікаў Дэпартамента аховы, участковых інспектараў, супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, міліцыянераў патрульна-паставой службы, інспектараў па справах непаўналетніх.

Напрыклад, на інспектараў ДАІ вучацца маладыя людзі, якія маюць юрыдычную або тэхнічную вышэйшую адукацыю. «Каб займацца рэгуляровачна-размеркавальнай дзейнасцю, умець складаць пратаколы, выносіць пастанаўленні, патрэбна валодаць пэўнымі ведамі, — заўважае **выкладчык цыкла тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі маёр міліцыі Надзея ГРЫГОР'ЕВА.** — На першы погляд здаецца, што быць інспектарам ДПС нескладана. Насамрэч, сітуацыі на дарозе бываюць розныя, і часта супрацоўнік ДАІ павінен быць кампетэнтным па многіх пытаннях».

Выкладаюць у навучальнай установе і блок сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Важны прадмет — фізічная культура. Вялікая ўвага ўдзяляецца і агнявой падрыхтоўцы курсантаў.

Адзін з асноўных прадметаў, які павінны засвоіць будучыя міліцыянеры, — тактыка-спецыяльная падрыхтоўка. Як расказвае **старшы выкладчык цыкла тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі падпалкоўнік міліцыі Яўген УРБАН,** падчас заняткаў курсанты атрымліваюць першапачатковыя веды, якія спатрэбяцца ім падчас выканання аператыўна-службовых задач. «Таксама ў іх фарміруюцца навыкі тактычных дзеянняў, яны вучацца правільна складаць працэсуальныя і службовыя дакументы, выконваць меры асабістай бяспекі пры нясенні службы», — удакладняе педагог з 17-гадовым стажам.

Сучасная моладзь любіць інтэрактыўныя заняткі. І курсанты цэнтра — не выключэнне. З задавальненнем яны наведваюць прадмет «Асновы крыміналістыкі». Падчас нашага візіту маладыя людзі вывучалі дактыласкапію: бралі адзін у аднаго адбіткі пальцаў, шукалі іх на розных паверхнях. «Большасць курсантаў з такім відам дзейнасці ніколі дагэтуль не сутыкалася, — гаворыць **старшы выкладчык цыкла спецыяльных дысцыплін падпалкоўнік міліцыі Юлія КАРТАШОВА.** — Ім вельмі цікава прымяняць пэўныя тэхнічныя сродкі і атрымліваць сляды самастойна. Запамінаць інфармацыю нашмат

Фота Аліны МАЗАВЕЦ

лепш, калі ты не проста слухаеш выкладчыка, а сам можаш паспрабаваць нешта зрабіць. У курсантаў адразу мяняецца настрой, калі ўдаецца знайсці той жа адбітак пальца, напрыклад, на аркушы паперы. Многія робяць выснову, што наша работа — не толькі вельмі складаная, але і надзвычай адказная, цікавая. А яшчэ яна небяспечная: супрацоўнікі міліцыі могуць пацярпець падчас выканання сваіх службовых абавязкаў. Невыпадкова мы вучым іх дзейнічаць тактычна правільна ў плане асабістай бяспекі, каб нідзе не пакінуць свае сляды, а таксама не знішчыць тыя, якія ўжо ёсць на месцы злачынства».

Выкладчык цыкла спецыяльных дысцыплін маёр міліцыі Дзмітрый КАБЕРДЗІН выкладае ў Цэнтры медыцынскую падрыхтоўку. І гэта, па словах ваеннага ўрача, не менш важны прадмет, чым усе астатнія. «Супрацоўнікі органаў унутраных спраў могуць апынуцца на месцы здарэння першымі і да прыбыцця медыкаў абавязаны аказаць першую медыцынскую дапамогу: няважна, неабходная яна пацярпеламу або злачынцу, — кажа выкладчык. — Супрацоўнікі, якія павышаюць у нас кваліфікацыю, расказваюць, што такія выпадкі нярэдкія, таму да ўсяго трэба быць падрыхтаванымі. Аднаму з навучэнцаў у свой час нават даводзілася роды прымаць».

НА ШЛЯХУ ДА МАРЫ

Курсант Аляксандр Дзегцярэнка будзе ўчастковым інспектарам міліцыі. За месяц да прыбыцця ў цэнтр дэмабілізаваўся з войска. Праходзіў службу па кантракце ва Узброеных Сілах. Да абмежаванняў, звязаных з навучаннем, Аляксандр прызвычаіўся хутка. Як прызнаецца малады чалавек, пасля арміі нават не было калі адвыкаць ад дысцыпліны і распарадку.

Нароўні з хлопцамі навучанне ў цэнтры праходзяць дзяўчаты. І на першы погляд складана сказаць, каго з іх у аўдыторыях больш. Гэта сведчыць толькі аб тым, што прыгожая палова чалавецтва не баіцца складанасцяў, таму без страху выбірае адказную работу.

— Дзяўчаты з мяккім характарам ніколі сюды не трапяць, — адзначае Аксана Грушэвіч. — Аднак, нягледзячы на спецыфічныя ўмовы, яны ўсё роўна застаюцца тут дзяўчатамі і жанчынамі. Падчас службовай дзейнасці яны выдатна спраўляюцца з выкананнем сваіх прафесійных абавязкаў.

Ганна Сяргеенка пасля навучання ў цэнтры будзе служыць у Дэпартаменце выканання пакарання. Калі больш канкрэтна, то ў папраўчай калоніі № 4 горада Гомеля, дзе адбываюць пакаранне жанчыны. Яна свядома абрала сабе прафесію, бо лічыць, што яе місія — дапамагаць жанчынам стаць на шлях выпраўлення. У Ганны ёсць псіхалагічная адукацыя, не хапае спецыяльнай падрыхтоўкі. «Калі я скажу, што мне нястрашна працаваць у такой спецыфічнай установе, то схітрую, — прызнаецца дзяўчына. — Але выбар мой свядомы. У дзяцінстве я часта гуляла ў міліцыянера. Ды і побач быў прыклад — мая мама, ужо маёр міліцыі запасу, шмат гадоў працавала ва ўпраўленні Дэпартамента выканання пакарання і выдатна спраўлялася з пастаўленымі задачамі. І я спраўлюся!»

Гучная справа

КАНСТРУКТЫЎНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ

Беларускія праваахоўнікі разам з замежнымі калегамі спынілі дзейнасць трансгранічнай злачыннай групы, якая займалася рэчавым кардынгам

Арганізатары былі затрыманы ў адзін дзень у Беларусі, а таксама ў Іспаніі. На працягу 10 гадоў яны нажываліся на тым, што, падманваючы людзей, завалодвалі іх грашыма, якія знаходзіліся на банкаўскіх рахунках. Колькасць пацярпелых сёння складана падлічыць. Па звестках праваахоўнікаў, гэта тысячы людзей па ўсім свеце. Дзеля ўстанаўлення асоб усіх злачынцаў, якія маюць дачыненне да незаконнай дзейнасці, Следчым камітэтам і Міністэрствам унутраных спраў наладжана шчыльнае супрацоўніцтва з замежнымі сілавікамі.

Пазбегнуць адказнасці не атрымаецца

— Рэчавы кардынг — не новы від крадзяжу для нашай краіны, мы з ім неаднаразова сутыкаліся, — адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС Андрэй КАВАЛЁЎ.** — Катэгорыя дадзеных злачынстваў раскрываецца ў шчыльным узаемадзеянні і пры міжнародным супрацоўніцтве.

Злачынная група трапіла ў поле зроку праваахоўнікаў некалькі гадоў таму. Пасля правядзення шэрагу аператыўна-тэхнічных мерапрыемстваў стала ясна: група прафесійная, зладжаная, фарміравалася на працягу некалькіх гадоў. У кожнага ўдзельніка былі свае задачы, за ажыццяўленне якіх ён атрымліваў грашовыя сродкі. Паступова да каманды, якая пачынала сваю незаконную дзейнасць у пачатку 2000-х у Азіі, падключалася нямала зацікаўленых людзей, якія хацелі вельмі хутка зарабіць.

— Арганізатар з Іспаніі мае беларускае грамадзянства, вышэйшую адукацыю, — удакладніла **начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Наталля САХАРЧУК.** — Большасць фігурантаў — дыпламаваныя эканамісты. Сярод удзельнікаў злачыннай групы ёсць і жанчына — настаўніца англійскай мовы. У яе маленькае дзіця, з гэтай прычыны пад варту яе не заключалі.

Як паведаміў Андрэй Кавалёў, каб даказаць злачынную дзейнасць групоўкі, супрацоўнікі міліцыі шчыльна працавалі з праваахоўнымі органамі ЗША. «У межах Нацыянальнага кантактнага пункта мы ўзаемадзейнічаем з 89 краінамі свету, Следчым камітэтам, працуем і па каналах Інтэрпола, — удакладніў начальнік галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС. — У выніку шматмесячнай перапіскі, абмену пэўнымі аператыўна-тэхнічнымі звесткамі нам удалося задакументаваць і даказаць дачыненне затрыманых менавіта да арганізацыі той дзейнасці, якую яны ажыццяўлялі. У даркнэце (ценявая сетка. — **Заўв. аўт.**) пэўныя асобы за крыптавалюту набывалі рэквізіты скампраметаваных банкаўскіх плацежных картак, потым ужо іншая група гэтымі рэквізітамі на анлайн-пляцоўках аплачвала неабходны тавар. Яшчэ адны фігуранты справы прадавалі яго на той ці іншай пляцоўцы са значна заніжаным коштам. Гэтым яны займаліся на працягу больш як 10 гадоў. Іх злачынная дзейнасць задакументаваная, даказана канкрэтнае дачыненне да яе пэўных асоб. Задзейнічана вельмі шмат людзей са шматлікіх краін свету».

У выніку на тэрыторыі Мінска ў адзін дзень было праведзена 12 ператрусаў, затрымана шэсць чалавек. Работа працягваецца.

Шчырае прызнанне — найлепшы выхад

— Грашовыя сродкі ў асноўным выкраданыя ў грамадзян краін Заходняй Еўропы і ЗША, — прыадкрываючы дэталі следства, удакладніў **намеснік начальніка ўпраўлення па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і інтэлектуальнай уласнасці Следчага камітэта Аляксандр СЯМЁНІК.** — Затрыманыя на тэрыторыі Беларусі саўдзельнікі — у асноўным людзі з вышэйшай эканамічнай адукацыяй, з ведамі ў галіне інфармацыйных тэхналогій, з прыстойных сем'яў, іх узрост — 30—36 гадоў. Прага нажывы лёгкіх грошай прывяла да таго, што яны арганізавалі на тэрыторыі Іспаніі і заходніх дзяржаў бізнес, звязаны з крадзяжом грашовых сродкаў.

Санкцыя артыкула, па якім узбуджана крымінальная справа, прадугледжвае ад 5 да 12 гадоў пазбаўлення волі са штрафам, канфіскацыяй маёмасці, пазбаўленнем права займацца пэўнай дзейнасцю. Затрыманыя прызнаюць сваё дачыненне да злачынства. Іншыя фігуранты крымінальнай справы ўстанаўліваюцца.

Як заўважыў **начальнік аддзела інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю цэнтральнага апарату Следчага камітэта Сяргей КАБАКОВІЧ,** еўрапейскія калегі настроены на канструктыўную работу з нашымі праваахоўнымі структурамі, прычым не толькі па гэтай крымінальнай справе. «Транснацыянальная злачыннасць на тое і ёсць, каб мы, праваахоўнікі, таксама ў транснацыянальным фармаце працавалі па спыненні любога роду злачынных замахаў: будуць яны на тэрыторыі нашай краіны або на тэрыторыі любой іншай дзяржавы», — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта.

Супрацоўнікі сілавых структур рэкамендуюць астатнім удзельнікам арганізаванай злачыннай групы прыйсці ў праваахоўныя органы і расказаць аб сваім удзеле ў ёй. «У такім выпадку, магчыма, гэта будзе мець для іх іншыя прававыя наступствы, не звязаныя з мерай стрымання ў выглядзе заключэння пад варту, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Сямёнік. — У выпадку супрацоўніцтва са следствам працэс прадугледжвае аб'ектыўную мінімізацыю пакарання».

Наталля Сахарчук падкрэсліла, што інтэрнэт дазваляе зламыснікам аб'ядноўвацца і весці злачынную дзейнасць, знаходзячыся ў розных краінах. Аднак, па яе словах, і паміж праваахоўнымі органамі сёння няма межаў: яны валодаюць усімі магчымасцямі сумесна супрацьстаяць парушэнню закона. Аперацыя, пра якую расказваецца ў публікацыі, акурат гэта пацвярджае.

Героі побач

Другі шанц на жыццё

У Горках участковы інспектар разам з мясцовым жыхаром выратавалі дзіця, якое танула

З пачатку ледаставу ўжо двое дзяцей сталі ахвярамі вады. На адну трагедыю магло быць больш, калі б не гэтыя мужчыны, якія апынуліся ў патрэбным месцы ў патрэбны час.

Надзвычайнае здарэнне адбылося ў Горках, што на Магілёўшчыне. Днём 24 студзеня дзесяцігадовы хлопчык апынуўся ў ледзяной вадзе мясцовай ракі. Самастойна выбрацца ён не мог — стаў клікаць на дапамогу.

Першым крыкі пачуў жыхар райцэнтра Андрэй Тунік. На дапамогу яму паспяшаўся і ўчастковы інспектар мясцовага РАУС лейтэнант міліцыі Вячаслаў Другамілаў, які акурат у гэты час, згодна са сваімі службовымі абавязкамі, адпрацоўваў прыватны сектар. Удваіх яны паспяхова выцягнулі хлопчыка з вады.

— Калі я ўбачыў хлопчыка, які тоне, адразу зняў з сябе вопратку, падпоўз да яго, схапіў за руку, але, паколькі адзенне было мокрае, не мог яго выцягнуць, — расказвае Андрэй Тунік. — Добра, што ў гэты час побач праходзіў супрацоўнік Горацкага РАУС. Сумесным намаганнямі нам удалося выцягнуць дзіця.

Мужчыны аказалі яму першую медыцынскую дапамогу і да прыезду медыкаў абагравалі сваім адзеннем. Пацярпелым, як потым высветлілася, аказаўся вучань 4 класа мясцовай школы. Хлопчык знаходзіцца ў бальніцы, яго жыццю нічога не пагражае. Участковы інспектар, які на наступны дзень наведаў выратаванага з салодкімі падарункамі, падбадзёрыў падлетка і пажадаў яму хутчэй папраўляцца. Не забыўся супрацоўнік міліцыі нагадаць і аб правілах бяспекі каля вадаёмаў у зімовы перыяд.

Мясцовы жыхар Андрэй ТУНІК і ўчастковы інспектар Горацкага РАУС лейтэнант міліцыі Вячаслаў ДРУГАМІЛАЎ, якія выратавалі жыццё хлопчыку.

Фота УУС Магілёўскага аблвыканкама.

Будзьце пільныя!

У СТАЛІЦЫ СТАНОВІЦЦА ПАПУЛЯРНЫМ НОВЫ ВІД МАХЛЯРСТВА

Толькі за мінулыя тры месяцы ў раённыя ўпраўленні мінскай міліцыі звярнулася звыш 40 грамадзян, якія сталі ахвярамі інтэрнэт-злачынцаў. Апошнія прапаноўваюць інтым-паслугі, за што просяць унесці перадаплату. У выніку — ні грошай, ні абяцаных уцех.

Як высветлілі праваахоўнікі, злачынцы рэгістравалі ў сацыяльнай сетцы фэйкавую старонку і ад імя дзяўчыны, якой не існуе, прапаноўвалі інтым за грошы. Калі патэнцыйны кліент пагаджаўся на прапанаваныя ўмовы, ад яго ў якасці гарантыі патрабавалі перадаплату. У некаторых выпадках пасля пераводу сродкаў на банкаўскую картку зносіны з заказчыкам спыняліся. У іншых — выманьванне грошай працягвалася: нібыта для арэнды кватэры ці паслуг таксі.

Як паведаміла **начальнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Наталля ГАНУСЕВІЧ**, зафіксаваны і факты шантажу. «Калі 30-гадовы мінчанін пасля пералічэння на рахунак злачынцаў 350 долараў адмовіўся следаваць далейшым інструкцыям, яму пачалі паступаць званкі з патрабаваннямі буйной сумы і пагрозамі фізічнай расправы, — расказала афіцыйны прадстаўнік мінскай міліцыі. — Злачынцы былі пераканаўчымі, паколькі мелі асабістыя фота, валодалі інфармацыяй аб месцы жыхарства і іншымі персанальнымі данымі. У выніку пацярпелы пералічыў яшчэ 2800 долараў і тысячу беларускіх рублёў. Да зґаворлівасці зламыснікі схілялі любымі метадамі. 43-гадоваму мужчыну, напрыклад, прыслалі яго сямейнае фота са словамі, што ведаюць, як выглядае яго дзіця».

Па фактах махлярскіх дзеянняў, а таксама вымагальніцтва Следчым камітэтам узбуджана крымінальная справа.

Лічбы

Тэлефануйце па справе!

Летась на «102» паступіла больш чым 1,1 млн званкоў

60 % з іх было звязана з кампетэнцыяй органаў унутраных спраў. Па астатніх зваротах супрацоўнікі міліцыі кансультавалі грамадзян або накіроўвалі іх у іншыя дзяржаўныя органы.

У той жа час практычна штодзённа спецлінію займаюць асобы, якім патрэбна не дапамога праваахоўнікаў, а магчымасць выказацца на іншыя тэмы або нават абразіць службовых асоб, уключаючы саміх аператараў «102». У мінулым годзе за такія парушэнні да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута каля 1,6 тысячы чалавек і ўзбуджана 1,7 тысячы крымінальных спраў.

Як адзначыў **начальнік упраўлення аператыўна-дзяжурнай службы міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Юрый КУЛЕШ,** усе асобы, якія выказвалі абразы і пагрозы ў адрас супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, устаноўлены і прыцягнуты да адказнасці.

Паважаныя грамадзяне, памятайце, што званкі без прычыны ў міліцыю перашкаджаюць своечасова аказваць дапамогу тым, каму яна патрэбна.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.

Блізкая ўлада

Набыццё акцый, работа транспарту, добраўпарадкаванне рынку

Якія яшчэ праблемы хвалююць жыхароў Дзяржынскага раёна

Восем чалавек выслухаў старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН падчас асабістага прыёму грамадзян у Дзяржынску. Некаторыя заяўнікі звярнуліся да кіраўніка цэнтральнага рэгіёна адразу з некалькімі пытаннямі. У прыватнасці старшыня назіральнага савета закрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат Нясвіжскі» Мікалай Яцута і генеральны дырэктар гэтага прадпрыемства Юрый Сікірыцкі, якія хадайнічалі аб набыцці акцый адкрытага акцыянернага таварыства «Вішнявецкі Агра» Стаўбцоўскага раёна, забеспячэнні мясаперапрацоўчай вытворчасці агракамбіната сыравінай.

Яны прасілі дазволу набыць акцыі ААТ «Вішнявецкі Агра» за адну базавую велічыню. Мікалай Яцута расказаў, што з 2020 года яны цесна супрацоўнічаюць з гаспадаркай, дапамагаюць пасяўнымі агрэгатамі, насеннем, у апрацоўцы пасяўных плошчаў. Стаўбцоўскі райвыканкам выдзеліў агракамбінату 300 гектараў зямлі ў часовае карыстанне на год, затым пралангіраваў дагавор. «Мы паспрабавалі свае сілы на гэтых землях і паказалі нядрэнны вынік — ураджайнасць азімага ячменю і азімай пшаніцы каля 61 цэнтнера з гектара. У лістападзе мінулага года звярнуліся ў Стаўбцоўскі райвыканкам з пісьмом аб гатоўнасці набыць 100 % акцый «Вішнявецкі Агра» з улікам таго, што 67 % іх знаходзіцца ва ўласнасці райвыканкама», — адзначыў Мікалай Яцута.

«Мы добра знаёмы з работай вашай кампаніі. Але на сёння пытанне аб пакупцы сельгасарганізацыі «Вішнявецкі Агра» не стаіць, — лічыць Аляксандр Турчын. — У некаторых гаспадарках вобласці захаваліся яшчэ старыя фермы, а тут працуюць два сучасныя малочнатварныя комплексы, у будаўніцтва якіх укладзены значныя сродкі. Таму гэтае прадпрыемства нельга прадаваць за адну базавую велічыню. Пры правільным кіраванні яно зможа паказаць добрыя вынікі».

У найбліжэйшы час будзе разлічаны сапраўдны кошт гаспадаркі з улікам даўгоў і актываў, прааналізавана і работа ЗАТ «Агракамбінат Нясвіжскі». З улікам гэтых фактараў будзе прынята рашэнне аб мэтазгоднасці продажу, рэзюмаваў Аляксандр Турчын.

Аляксандр Яцута і Юрый Сікірыцкі таксама расказалі, што сельгасарганізацыі некаторых раёнаў працяглы час не пералічваюць грошы на рахунак «Агракамбіната Нясвіжскі» за аказаныя паслугі. Аляксандр Турчын даручыў прынесці дакументы, якія пацвярджаюць гэтыя факты. Іх вывучаць, прааналізуюць, на аснове чаго будзе складзены графік пагашэння запазычанасці.

Вольга Мулярчык прасіла пасадзейнічаць у добраўпарадкаванні вуліцы Лясной у вёсцы Дворышча Дзяржынскага раёна. Гэта тупіковая вуліца, якая вядзе да зямельных участкаў. Менавіта тут будуе дом сям'я Вольгі з тым, каб у далейшым пераехаць сюды з Мінска. «Адрэзак дарогі пасля дажджу або вясенняга разводдзя ў жахлівым стане — ні прайсці, ні праехаць, а зімой патанае ў снежных гурбах. Я не прашу, каб тут паклалі асфальт — хоць бы рэгулярна падсыпалі, грэйдзіравалі, расчышчалі ад снегу гэты ўчастак, працягласць якога каля трохсот метраў», — расказала жанчына.

Аляксандр Турчын заўважыў, што вырашэнне гэтага пытання не патрабуе вялікіх капітальных выдаткаў. Ён даручыў адпаведным службам разраўняць дарогу і падсыпаць гравіем, як толькі дазволяць умовы надвор'я. Старшыня Дзяржынскага райвыканкама Максім Лысенка дадаў, што нядаўна быў зацверджаны новы старшыня ЖКГ, распрацаваны графік ачысткі дарог ад снегу.

Наталля Гаўрылава звярнулася з просьбай аб павелічэнні колькасці маршрутаў гарадскога транспарту. Жыхары мікрараёна Макаўчыцы раніцай не паспяваюць даехаць да электрычкі на чыгуначным вакзале і вымушаны карыстацца паслугамі таксі. Наталля Васільеўна жыве ў Дзяржынску, працуе загадчыцай магазіна ў Мінску. Многія жыхары мікрараёна таксама ездзяць на работу або вучобу ў сталіцу. «Мала і гарадскіх аўтобусаў, яны практычна дабітыя, спазняюцца, талончык набыць немагчыма, — канстатавала Наталля Васільеўна. — Дзяржынск — горад-спадарожнік Мінска. Людзей тут з кожным годам становіцца больш, але транспартныя зносіны не развіваюцца».

Аляксандр Турчын адзначыў, што аўтапарк Дзяржынска сапраўды працуе дрэнна, пра што сведчаць пастаянныя скаргі жыхароў. Ён даручыў навесці парадак у транспартнай галіне на працягу трох месяцаў і вырашыць праблему з набыццём талонаў.

Алег Чарнагурскі не задаволены работай рынку Дзяржынска сапраўды працуе дрэнна, пра што сведчаць пастаянныя скаргі жыхароў. Ён даручыў навесці парадак у транспартнай галіне на працягу трох месяцаў і вырашыць праблему з набыццём талонаў.

Алег Чарнагурскі не задаволены работай рынку Дзяржынска сапраўды працуе дрэнна, пра што сведчаць пастаянныя скаргі жыхароў. Ён даручыў навесці парадак у транспартнай галіне на працягу трох месяцаў і вырашыць праблему з набыццём талонаў.

Аляксандр Яцута і Юрый Сікірыцкі таксама расказалі, што сельгасарганізацыі некаторых раёнаў працяглы час не пералічваюць грошы на рахунак «Агракамбіната Нясвіжскі» за аказаныя паслугі. Аляксандр Турчын даручыў прынесці дакументы, якія пацвярджаюць гэтыя факты. Іх вывучаць, прааналізуюць, на аснове чаго будзе складзены графік пагашэння запазычанасці.

Вольга Мулярчык прасіла пасадзейнічаць у добраўпарадкаванні вуліцы Лясной у вёсцы Дворышча Дзяржынскага раёна. Гэта тупіковая вуліца, якая вядзе да зямельных участкаў. Менавіта тут будуе дом сям'я Вольгі з тым, каб у далейшым пераехаць сюды з Мінска. «Адрэзак дарогі пасля дажджу або вясенняга разводдзя ў жахлівым стане — ні прайсці, ні праехаць, а зімой патанае ў снежных гурбах. Я не прашу, каб тут паклалі асфальт — хоць бы рэгулярна падсыпалі, грэйдзіравалі, расчышчалі ад снегу гэты ўчастак, працягласць якога каля трохсот метраў», — расказала жанчына.

Аляксандр Турчын заўважыў, што вырашэнне гэтага пытання не патрабуе вялікіх капітальных выдаткаў. Ён даручыў адпаведным службам разраўняць дарогу і падсыпаць гравіем, як толькі дазволяць умовы надвор'я. Старшыня Дзяржынскага райвыканкама Максім Лысенка дадаў, што нядаўна быў зацверджаны новы старшыня ЖКГ, распрацаваны графік ачысткі дарог ад снегу.

Наталля Гаўрылава звярнулася з просьбай аб павелічэнні колькасці маршрутаў гарадскога транспарту. Жыхары мікрараёна Макаўчыцы раніцай не паспяваюць даехаць да электрычкі на чыгуначным вакзале і вымушаны карыстацца паслугамі таксі. Наталля Васільеўна жыве ў Дзяржынску, працуе загадчыцай магазіна ў Мінску. Многія жыхары мікрараёна таксама ездзяць на работу або вучобу ў сталіцу. «Мала і гарадскіх аўтобусаў, яны практычна дабітыя, спазняюцца, талончык набыць немагчыма, — канстатавала Наталля Васільеўна. — Дзяржынск — горад-спадарожнік Мінска. Людзей тут з кожным годам становіцца больш, але транспартныя зносіны не развіваюцца».

Аляксандр Турчын адзначыў, што аўтапарк

ЗАХВАРАЛЬНАСЦЬ НА COVID-19, ВРІ І ГРЫП ДРУГІ ТЫДЗЕНЬ РАСЦЕ

«ЧЭРГІ НЕ ЗВЯЗАНЫ З АДСУТНАСЦЮ ЎРАЧОЎ»

Паводле слоў **загадчыка аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Веранікі ВЫСОЦКАЙ**, па даных малекулярна-біялагічнага маніторынгу, у краіне, акрамя каранавіруснай інфекцыі, цяпер актыўна цыркулююць вірус грыпу і негрыпозныя вірусы.

— У некаторых паліклініках розных раёнаў Мінска ўжо да моманту адкрыцця раніцай у панядзелак з'явіліся чэргі. Мы звязваем гэта з першым на тыдні працоўным днём. Большая частка прыйшла абследавацца лабараторна — прайсці тэсты, — кажа **першы намеснік міністра аховы здароўя Алена КРАТКОВА**. — Аднак гэта не тая сітуацыя, калі вынік тэста адбіваецца на выбары тэрапіі. Ад каранавіруснай інфекцыі няма этыятропнага лячэння. Калі захворванне працякае ў лёгкай форме, мы просім заставацца дома і прытрымлівацца рэкамендацый як пры рэспіраторнай інфекцыі: шмат піць, захоўваць пасцельны рэжым, пры павышэнні тэмпературы прымаць парацэтамол. Сімптаматычнае лячэнне тут — як і пры іншых рэспіраторных інфекцыях.

Алена Краткова заклікала заставацца дома, асабліва калі ў вас няма патрэбы ў бальнічным. У адваротным выпадку прыходзіць у паліклінікі на працягу ўсяго дня, а не да моманту адкрыцця медустановы, каб не стаяць у чэргах на вуліцы, тым больш што надвор'е не самае спрыяльнае. І нагадала, што ў гандлёвых цэнтрах і аптэках прадаюцца тэсты на антыген, яны валодаюць дастаткова высокай адчувальнасцю, у тым ліку і да штама «амікрон». Пры жаданні можна пратэсціравацца самастойна (вынікі прымаюць да ўвагі і ўрачы), каб знізіць нагрузку на амбулаторна-паліклінічнае звяно.

Іншая тактыка мусіць быць у дачыненні да пажылых людзей. Яны часта трапляюць у стацыянар у дастаткова цяжкім стане, калі час упушчаны. Таму, калі тэмпература трымаецца доўга, стан пагаршаецца, са зваротам да медыкаў не трэба марудзіць.

Большасць тых, хто цяпер хварэе, скардзіцца на кашаль, насмарк, залажанасць носа, болі ў горле і павышэнне тэмпературы.

— Клінічныя праявы з'яўляюцца цяпер хутчэй, але працягласць захворвання скарацілася, — падкрэсліла Алена Краткова.

У дапамогу медыкам у паліклініках накіраваны інтэрны і студэнты медуніверсітэтаў. У якасці валанцёраў ужо працуе каля 700 студэнтаў. Прыпынены і курсы павышэння кваліфікацыі для медыкаў, яны адкліканы на свае працоўныя месцы. Дапамогу аказваюць і ўрачы-спецыялісты.

— Чэргі не звязаны з адсутнасцю ўрачоў, — падкрэсліла Алена Краткова. — Медыцынскія работнікі таксама хварэюць, але сярод іх самы высокі працэнт вакцынацыі, праўда, і рызыка заразіцца больш высокая. Прышчэпка многім дазваляе ў кароткія тэрміны, каля пяці дзён, вярнуцца ў строй. Захваральнасць сярод урачоў адсочваецца, усе паліклінікі маюць планы работы на розныя выпадкі, у тым ліку і рост наведвальнасці.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ДЛЯ ХВОРЫХ З COVID-19 ПЕРАПРАФІЛЯВАНА 11 ТЫСЯЧ ЛОЖКАЎ

Алена Краткова праінфармавала, што змянілася тактыка работы з бальнічнымі лістамі. Пры COVID-19 і адсутнасці клінічных сімптомаў лісток непрацаздольнасці выдаецца на 5—7 дзён, з сімптомамі — да 10 дзён. Калі патрабуецца больш доўгае лячэнне — да 21 дня. Нагадаем, што хворыя школьнікі могуць без даведкі ад урача знаходзіцца дома да пяці дзён, такая ж мера ўведзена для навучэнцаў і студэнтаў з мэтай знізіць нагрузку на паліклінікі.

У краіне для хворых на каранавірусную інфекцыю перапрафілявана больш за 11 тысяч ложкаў, гэта 13 % ад усяго ложкавага фонду. З іх занята каля 10 тысяч. 87 % месцаў у стацыянарах адведзена для аказання планавай дапамогі.

— «Амікрон» — новы штам, толькі ў 2 % дзяцей ён выклікае цяжкія формы, — дадае **загадчык кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, галоўны пазаштатны спецыяліст па дзіцячых інфекцыйных хваробах Міністэрства аховы здароўя Аксана РАМАНАВА**. — Звычайна дзеці хварэюць лёгка: тэмпература, кашаль, заложанасць носа, фарынгіт. У старэйшых можа дадавацца задышка і галаўны боль. Мультысістэмны запаленчы сіндром педыятры лячыць навучыліся — у любой клініцы збіраецца кансіліум і прызначаецца тэрапія.

ВАКЦЫНАВАЦЦА І НАСІЦЬ МАСКІ!

Як падкрэсліў **загадчык кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый БелМАПА Юрый ГОРБІЧ**, дамінантным штамам цяпер з'яўляецца «амікрон», і адрозніць яго клініку ад іншай рэспіраторнай інфекцыі складана.

— Каля васьмі тысяч пацыентаў у стацыянарах хварэюць на пнеўманіі, каля 14 % з іх — у цяжкай форме. Колькасць пацыентаў, якія знаходзяцца на апаратах ШВЛ, скарацілася. Гэта асаблівасць «амікрона», які працякае ў больш лёгкай форме. Аднак у групе рызыкі па-ранейшаму пажылыя людзі і тыя, хто мае цяжкія хранічныя захворванні, — адзначыла першы намеснік міністра.

Яна расказала, што лекаў, сродкаў індывідуальнай аховы, кіслародных пунктаў і астатняга неабходнага у медыцынскіх установах хапае, а запасы пастаянна папаўняюцца.

ДЗЕЦІ ХВАРЭЮЦЬ У ЛЁГКАЙ ФОРМЕ

У гэту хвалю, як і прагназавалася, больш уцягнутымі ў інфекцыйны працэс аказаліся дзеці. Большасць хварэе дома, аднак ёсць і шпіталізаваныя — цяпер у краіне іх амаль 700, прычым палова — у Мінску. На раніцу панядзелка ў рэанімацыі знаходзілася адно дзіця.

— Ложкаў для дзяцей дастаткова, педыятрычная служба навучана выяўленню і лячэнню інфекцыі. Ва ўсіх рэгіёнах функцыянуюць групы экспертаў, якія гатовы аказаць дапамогу 24 гадзіны ў суткі, — адзначыла Алена Краткова.

— Нам пашчасціла, што многія вакцынаваліся ці перахварэлі. У такім выпадку захворванне працякае лягчэй. У невакцынаваных, асабліва з груп рызыкі, і «амікрон» можа выклікаць цяжкі ход, з перамяшчэннем у рэанімацыю. Параіць можна або вакцынавацца, або берагчыся.

Калі 58 % беларусаў вакцынаваны першай дозай, 48 % прайшлі поўны курс вакцынацыі. Тым, хто яшчэ не вакцынаваўся, і тым, у каго падышоў тэрмін бустэрнай прышчэпкі, медыкі раяць тэрмінова гэта зрабіць, пункты вакцынацыі працуюць і ў выхадныя дні. А вось узмацнення масачнага рэжыму ў краіне ўводзіцца не будзе, пры гэтым кожны абавязаны клапаціцца пра сябе і навакольных.

— Наконт масачнага рэжыму наша пазіцыя адназначная: калі ідзе распаўсюджанне высокаразнага віруса, мы носім маскі. Маска абараняе найперш навакольных ад нас і ў меншай ступені нас самих. Так, калі нам напляваць на навакольных, маскі можна не насіць. Як узмацніць масачны рэжым? Прымушаць? Саджаць? Пугай ці розгамі біць? Разумныя людзі ў стане самі зразумець, што трэба насіць маскі. А з тымі, каму напляваць, мы нічога не зробім», — адзначыў Юрый Горбіч.

Алена КРАВЕЦ.

Надвор'е

Цыклон «Надзя» даў нам яшчэ снегу

На гэтым тыдні ў нас будзе адносна холадна і досыць снежна, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Фота Анатоля КЛЕЦКУКА.

Гэты паўночнаатлантычны цыклон, які панаваў на тэрыторыі нашай краіны апошнім часам, вярнуў зімовы пейзаж у паўднёва-заходнія рэгіёны краіны, дзе снег ужо амаль растаў. А на раніцу панядзелка паўсюдна па краіне назіраецца снежнае покрыва вышынёй ад 1 сантыметра па паўднёвым захадзе да 32 сантыметраў па паўночным усходзе, на метэастанцыі «Мсціслаў» вышыня гурбаў дасягае 38 сантыметраў.

У першы дзень лютага цыклон апынецца над Маскоўскай вобласцю, а ў нашу краіну будзе паступаць няўстойлівая паветраная маса. Таму ў аўторак у многіх раёнах краіны пройдзе невялікі снег, месцамі слабая завіруха. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер заходні парывісты. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад нуля да мінус 5 градусаў.

А вось у сераду на тэрыторыю Беларусі перамесціцца чарговая сістэма атмасферных франтоў з Польшчы. Па большай частцы краіны пройдзе снег, мокры снег, раніцай і ўдзень месцамі наліпанне мокрага снегу. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер паўднёвай чвэрці ўмераны. Тэмпература паветра ўначы будзе мінус 2—9 градусаў, пры праясненнях да 11 марозу. Удзень тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла.

У сярэдзіне тыдня, 3 лютага, захаваецца ўплыў франтальных раздзелаў, якія паступова сыходзяць на ўсход, удзень на заходніх раёны краіны пачне распаўсюджвацца зона павышанага атмасфернага ціску. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень пераважна па ўсходняй палове краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёвы, з пераходам на паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да мінус 9 градусаў, пры праясненнях да 12 марозу. Удзень будзе ад мінус 6 градусаў да 1 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу, 4 лютага, будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па захадзе краіны пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, будзе назірацца слабы галалёд. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе мінус 8 — мінус 15 градусаў, пры праясненнях да 18 марозу. Удзень тэмпература паветра складзе мінус 2—9 градусаў. У заходніх раёнах краіны ўначы будзе мінус 5—7 градусаў, удзень — каля нуля. Люты — ён у нас такі.

Сяргей КУРКАЧ.

З ЛЮТАГА ВЫРАС БЮДЖЭТ ПРАЖЫТАЧНАГА МІНІМУМУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У сувязі са зменам БПМ з 1 лютага аўтаматычна пераглядаюцца ўбудаваныя ў сістэму сацыяльнай абароны розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічаюцца ад памеру БПМ. Яны павялічыліся з ростам БПМ на тры працэнты.

Так, у сувязі з ростам БПМ і сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у краіне за IV квартал 2021 года (1 541,60 рубля, рост на 8,8 %) павялічваюцца памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў на першае дзіця цяпер складае 539,56 рубля, на другое і наступных дзяцей — 616,64 рубля, на дзіця-інваліда — 693,72 рубля. Тэмп росту памераў дапамогі з лютага 2022 года складае 108,8 % у параўнанні са студзенем 2022 года. У 2022 годзе на выплату дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў запланавана выдаткаваць 1,7 мільярда рублёў.

Павялічыліся і аднаразовыя дапамогі пры нараджэнні дзяцей. Пры нараджэнні першага дзіцяці выплачваецца 2965 рублёў 50 капеек, другога і наступных — 4151 рубель 70 капеек.

Даплата да пенсій непрацоўным пенсіянерам, якія дасягнулі ўзросту 75 гадоў, складае цяпер 55 рублёў 61 капейку, 80 гадоў — 74 рублі 14 капеек. Надбаўкі па доглядзе інвалідаў I групы павялічыліся да 74 рублёў 14 капеек, пенсіянераў, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту — 37 рублёў 7 капеек.

Павышаюцца і мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі. Сацыяльная пенсія для мужчын, якія дасягнулі ўзросту 65 гадоў, і жанчын з 60 гадоў складае цяпер 148 рублёў 28 капеек.



Нагадаем, гэта планавы перагляд дапамог, даплат да пенсій, сацыяльных і мінімальных працоўных пенсій, які адбываецца кожны квартал.

Алена КРАВЕЦ.

ВЯСНА ПРЫЗЯМЛІЛАСЯ Ў ПАДНЯБЕСНАЙ

Як кітайцы адзначаюць навагоднія святы?

Ужо люты настаў, а чарада свят усё працягваецца. Сёння ў Кітай прыйшла вясна. Дакладней, Чуньцзэ — Свята вясны. Так паэтычна тут называюць пачатак новага года. Сёлета гэта 4720-ы. І адзначаць кітайскі Новы год будуць не толькі на яго «радзіме», а і без перабольшання па ўсім свеце. У Паднябеснай з нагоды Чуньцзэ распачаліся вялікія святочныя вакацыі. Як правільна сустрэць вясну і гаспадара года — Вадзянога Тыгра — «Звяздзе» расказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Се СЯАЮН.

ТРАДЫЦЫІ НА ТЫСЯЧАГОДДЗІ

Свята вясны мае доўгую гісторыю. Кітайцы адзначаюць яго ўжо больш за 4000 гадоў.

— Старажытны Кітай быў традыцыйным земляробчым грамадствам, кітайцы надавалі вялікае значэнне пачатку года, калі вясна вяртаецца на зямлю і прырода абнаўляецца. Штогод у гэты час здзяйсняліся ахвярапрынашэнні і праводзіліся святочныя мерапрыемствы, на якіх людзі маліліся аб добрым надвор'і і багатым ураджаі ў новым годзе. Менавіта адсюль і пайшло Свята вясны, — заўважыў Се Сяаюн. — Яго таксама называюць Го Нянь (гэта значыць «адзначаць Новы год»). З гэтым звязана вельмі цікавае народнае паданне. У старажытным Кітаі людзі верылі ў існаванне пачвары па імені Нянь. Яна штогод на 30-ы дзень дванаццатага месяца з'яўлялася і знішчала ўсё жывое навокал. У незлічоных бітвах з Нянем людзі выявілі сакрэт перамогі над ім. Хоць пачвара лютая, але яна апасаецца чырвонага, агню і гучных гукаў. Каб паспяхова выгнаць пачвару, кожная сям'я рабіла парныя чырвоныя палосы з пажаданнямі, запускала петарды. Гэтыя дзеянні з цягам часу ператварыліся ў святочныя звычаі.

Гісторыя Свята вясны — гэта не толькі народныя звычаі пакланення багам і памінання продкаў, малітваў аб шчасці і выгнанні злых духаў, уз'яднанне сваякоў і сяброў, святкаванне і весялосць, але і канцэнтраванае адлюстраванне традыцыйнага кітайскага мыслення і культуры, сімваламі якога з'яўляюцца адпаведнасць пары года, павага да продкаў, суіснаванне ў гармоніі.

«ЧУСІ» І «ШОЎСУЭЙ»

Культура Свята вясны перадаецца з пакалення ў пакаленне. На працягу ўсяго працэсу развіцця і эвалюцыі ў культуру Чуньцзэ ўвесь час інтэграваліся розныя народныя звычаі з розных рэгіёнаў Кітая, паступова фарміраваліся некаторыя ўнікальныя культурныя з'явы, якія працягваюцца і дагэтуль.

— Перыяд напярэдадні свята называецца «чусі», гэта важны час для ўз'яднання сям'і, — расказаў пасол КНР. — Многія людзі не кладуцца спаць усю ноч, каб «адсвяткаваць Свята вясны», гэтая традыцыя называецца «шоўсуэй». Дарослыя раздаюць дзецям святочныя грошы ў канвертах перад сном, жадаючы ім здаровага росту. Пасля таго як гадзіннік б'е поўнач, жыхары паўночных рэгіёнаў Кітая звычайна ласуюцца пельменямі ў форме зліткаў, спадзеючыся «прыцягнуць багацце і валодаць скарбамі» ў новым годзе, а жыхары поўдня ядуць клейкія рысавыя шарыкі, гэтая традыцыя азначае «ўз'яднанне сям'і». Раніцай на наступны дзень прынята хадзіць у госці да сваякоў і сяброў, віншаваць з Новым годам і жадаць адзін аднаму ўсяго найлепшага. Многія таксама любяць рыхтаваць рысавыя аладкі на пары, расклейваць навагоднія карцінкі, перамяшчацца на хадулях і танцаваць янгэ (самы папулярны ў Паднябеснай від народнага танцавальнага мастацтва, унесены ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Кітая. — **Рэд.**). Усе гэтыя ўнікальныя культурныя з'явы кітайцы звязваюць з надзеяй на лепшае жыццё, прыхільнасцю да сямейных каштоўнасцяў, а таксама імкненнем да яднання і сумеснага шчаслівага жыцця.

ТРЫ МІЛЬЯРДЫ ПАСАЖЫРАЎ

Звычаі Свята вясны ідуць у нагу з часам. З'яўляюцца новыя традыцыі.

— У памяці многіх людзей бесперапынны грукат феерверкаў раней быў самым яркім сімвалам кітайскага Новага года, але па меры большай экалагічнай дасведчанасці на змену традыцыйным феерверкам прыйшлі электронныя хлапушкі, падвясныя ліхтары і іншыя больш бяспечныя і экалагічна чыстыя забавы, — адзначыў Се Сяаюн. — Выраз «ёсць у вас грошы ці не, вяртайцеся дадому на Новы год» актуальны і цяпер. Жаданне людзей, якія працуюць ці вучацца далёка ад дома, вярнуцца ў родныя мясціны на Новы год, прыводзіць да перамяшчэння больш як трох мільярдаў чалавек на працягу 40 дзён (за 15 дзён да свята і 25 дзён пасля яго) кожны год. Такая з'ява атрымала назву «чун'юнь», гэта значыць пасажырскія перавозкі ў перыяд Свята вясны. З развіццём эканомікі і змяненнем поглядаў людзей узнікла сітуацыя, калі пажылыя людзі едуць да месцаў работы сваіх дзяцей, каб разам адсвяткаваць Новы год. Змянілася і канцэпцыя саміх святочных пасажырскіх перавозак, калі раней важна было дапамагчы пасажырам дабрацца да патрэбнага пункта прызначэння ў такі важны і адначасова актыўны для перавозак перыяд, то цяпер важна дапамагчы даехаць з камфортам. Акцэнт на камфорце яскрава адлюстроўвае працэсы эканамічных пераўтварэнняў і мадэрнізацыі Кітая.

ЧУНЗЭ Ў «ВОБЛАКУ»

У апошнія два гады, каб знізіць рызыку распаўсюджвання COVID-19, многія людзі ў Кітаі, якія працуюць далёка ад дома, адгукнуліся на прапанову адсвяткаваць Новы год без вяртання дадому.

— Цяпер «воблачныя сацыяльныя сеткі» ў інтэрнэце сталі самым папулярным спосабам святкавання Новага года (людзі з розных куткоў краіны разам збіраюцца адзначыць свята анлайн), а анімацыйныя віншаванні са Святам вясны, створаныя з дапамогай мабільных дадаткаў, сталі амаль абавязковым «навагоднім таварам», — заўважыў кітайскі дыпламат. — Хоць з цягам часу звычаі святкавання Новага года ўвесь час змяняюцца, агульная ідэя застаецца незменнай — гэта развітанне са старым і сустрэча новага, уз'яднанне сям'і і імкненне да гармоніі. Акрамя таго, Свята вясны бесперапынна выпраменьвае новую жыццёвую сілу, адаптуючыся да павеваў часу і мясцовых умоў.

ГЛАБАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ

Уплыў Свята вясны адчуваецца ва ўсім свеце.

— З'яўляючыся важнай складанай часткай кітайскай цывілізацыі, Свята Вясны змяшчае багатыя, прагрэсіўныя і адметныя элементы кітайскай культуры і з'яўляецца выключна каштоўнай з'явай сусветнай культуры. Па меры таго, як КНР працягвае адкрывацца і выходзіць на сусветную арэну, крокі кітайскага народа распаўсюджваюцца на ўсіх пяці кантынентах, — падкрэсліў Се Сяаюн. — Свята вясны таксама паступова ператвараецца ў глабальны фестываль і становіцца мостам дружбы, які злучае кітайцаў і народы свету. Паводле статыстычных даных, каля двух мільярдаў чалавек, у тым ліку кітайцаў, якія пражываюць па ўсім свеце, і сяброў з усіх краін штогод адзначае гэтае свята. Амаль 20 краін і рэгіёнаў аб'явілі яго агульнанацыянальным святочным нерабочым днём або афіцыйным выхадным у некаторых гарадах.

Кожны год падчас Свята вясны многія міжнародныя дзеячы віншуюць кітайскі народ з Новым годам, а знакавыя маляўнічыя мясціны ў многіх краінах упрыгожаны ў адпаведным стылі — увесь свет напаўняецца атмасферай кітайскага Новага года. Беручы ўдзел у святе, народы ўсяго свету могуць усвядоміць згуртаванасць, гармонію, шчасце і надзею, тым самым глыбей адчуць кітайскую культуру і кітайскі дух.

СІЛА ТЫГРА

— Свята вясны ўжо ўстанавіла непарыўную сувязь з Беларуссю. Што датычыцца дыпламатычных супрацоўнікаў пасольства, то акрамя традыцыйнага сумеснага расклейвання парных палос чырвонай паперы з навагоднімі пажаданнямі, гатавання пельменяў і сумеснай вячэры напярэдадні кітайскага Новага года ў адпаведнасці з кітайскімі традыцыямі, ладзяцца маляўнічыя і разнастайныя мерапрыемствы па культурным абмене ў рамках Свята вясны ў Беларусі. «Вясёлае Свята вясны», паспяхова арганізаванае і праведзенае пасольствам ужо сем разоў, стала «фірменнай праграмай», якая заваявала прызнанне беларусаў. У Мінску, Гродне, Барысаве і іншых гарадах Беларусі ладзяцца навагоднія песенна-танцавальныя вечарыны, культурныя кірмашы, а таксама іншыя мерапрыемствы. Цэнтральны оперны тэатр і творчыя калектывы з правінцый Хэнань, Ганьсу, Цзянсу, горада Нанкін і іншых правінцый і гарадоў былі запрошаны для выступлення ў вашай краіне, — паведаміў пасол КНР. — Свята вясны становіцца агульным для Кітая і Беларусі, а культурны абмен дазваляе двум народам вучыцца адна ў аднаго і ўзбагачаць агульны культурны змест.

Згодна з кітайскім месяцовым календаром, год Тыгра надышоў 1 лютага 2022 года і будзе доўжыцца да 22 студзеня 2023-га.

— У традыцыйнай кітайскай культуры тыгр з'яўляецца царом гор і лясоў, які пакарае звяроў і ахоўвае спакой краіны. Акрамя таго, гэтая жывёла з'яўляецца сімвалам адвагі, сілы і бясстрашнасці. 2022-ы таксама супадае з 30-годдзем устанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі. За гэты час кітайска-беларускія адносіны вытрымалі выпрабаванне перыпетыямі міжнароднай абстаноўкі і па-ранейшаму захоўваюць жыццёвую сілу і энергію. Супрацоўніцтва ў розных галінах дасягнула буйных вынікаў, што прынесла вялікую карысць народам дзвюх краін. Два тыдні таму Старшыня КНР Сі Цзіньпін правёў паспяховую тэлефонную размову з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, падчас якой былі абмеркаваны перспектывы развіцця кітайска-беларускіх адносін.

Я цвёрда веру, што дзякуючы агульнаму клопату і стратэгічнаму кіраўніцтву кіраўнікоў дзвюх дзяржаў, а таксама сумесным намаганням адпаведных ведамстваў і прадстаўнікоў усіх слаёў грамадства, кітайска-беларускія адносіны ўсебаковага стратэгічнага партнёрства абавязкова сустрэнуць яшчэ больш чароўную вясну, а з надыходам года Тыгра прадэманструюць яшчэ большую моц і выйдуць на больш высокі ўзровень на карысць нашых краін і народаў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ДАСЛОЎНА

«КІТАЙ СТАЎ АДНЫМ З НАЙВАЖНЕЙШЫХ ГАНДЛЁВЫХ І ІНВЕСТЫЦЫЙНЫХ ПАРТНЁРАЎ БЕЛАРУСІ»

Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў у Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу.

«Раней ураду і МЗС даручалася перагледзець прыярытэты Беларусі на карысць тых рэгіёнаў свету, якія маюць вялікі патэнцыял і ўзаемны інтарэс. Найважнейшым фактарам супрацоўніцтва ў Азіі для нас з'яўляецца дружба з Кітаем. У студзені адзначылі знакавую вяху на гэтым шляху — 30-годдзе ўстанаўлення дыпадносін», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што ў канцы мінулага года ім была прынята дырэктыва па паглыбленні стратэгічнага супрацоўніцтва з Кітаем па шырокім спектры напрамкаў. Плануецца рэалізацыя некалькіх дзясяткаў канкрэтных праектаў у сферах палітыкі, эканомікі, адукацыі, навукі і тэхналогій.

«Кітай стаў адным з найважнейшых гандлёвых і інвестыцыйных партнёраў Беларусі. Назаву толькі некаторыя параметры: гадавы абарот перавышае ўжо $5,5 млрд, рэалізаваны 23 інвестпраекты на мільярды долараў. Да 2025 года мы плануем экспартаваць у Кітай беларускія тавары на суму да $3 млрд», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Ён дадаў, што будзе развівацца і галоўны беларуска-кітайскі праект — індустрыяльны парк «Вялікі камень». «Нягледзячы на ўсе складанасці 2021 года, у парк прыйшлі 20 рэзідэнтаў з шасці краін. Аб'ём інвестыцый склаў мільёны долараў. Частку вытворчасцяў фарміруюць абсалютна новыя кампетэнцыі і магчымасці для Беларусі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У ТЭМУ

РАСЦВІТАЕ СЛІВА МЭЙ

Сапраўдным сімвалам Свята вясны ў Паднябеснай стала сліва мэй (мэйхуа), якая разам з архідэяй, бамбукам і хрызантэмай адносіцца да «чатырох высакародных» (сы цзюнь-цзы) раслін Кітая. Яна пачынае цвісці якраз у лютым. Сліва мэй сімвалізуе такія якасці, як годнасць і сцісласць. Так што Чунээ мае сваю прыгожую вытанчаную кветку. Радзіма мэйхуа — раён вялікай кітайскай ракі Янцзы. Увогуле ў Кітае вядома звыш 230 відаў слівы. Гэтыя расліны культывуюцца больш чым тры тысячы гадоў.

У лютым у Паднябеснай паціху адчуваецца дыханне вясны, і слупкі тэрмометраў пачынаюць павольна, але дакладна паўзці ўверх. У Тыбеце пакуль яшчэ зімовы кліматычны расклад. А ў Пекіне звычайна ўжо дадатныя тэмпературы, але яшчэ халаднавата. Іншая справа — поўдзень Кітая, дзе днём носяць адзенне з кароткім рукавом, а куртакі накідваюць толькі з заходам сонца. На востраве Хайнань можна атрымаць асалоду ад курортнага жыцця. У наваколлях горада Хайкоу слупок тэрмометра дасягае плюс 22 градусаў, а на курортах Саны паветра праграваецца яшчэ мацней — да 26 °С. У Ганконгу і Гуанчжоу крыху менш — плюс 17-19 градусаў.

Карэспандэнт «Звязды» зрабіла сэлфі з жывым сімвалам года — тыгрыцай Ярославай. Кажуць, гэта прыносіць удачу.

Год Тыгра

СЭЛФІ З ДРАПЕЖНІКАМ... НА ЎДАЧУ,

або Таго, хто пабачыў белага паласатага, чакаюць прасвятленне і шчасце

Па кітайскім календары год Тыгра пачнецца 1 лютага. На Усходзе вераць, што, калі паласатага звера правільна папрасіць, ён абавязкова прынясе ўдачу. Таму карэспандэнт «Звязды», якая сама нарадзілася ў год Тыгра, накіравалася ў Мінскі заапарк. Пасля назірання за звычкамі драпежнікаў не ўтрымалася і сфатаграфавалася з жывым сімвалам года. А таксама даведалася, як задобрылі сваіх паласатых гадаванцаў работнікі заапарка.

БЕНГАЛЬСКАЯ ІСКРА ПАКУЛЬ НЕ ПРАБЕГЛА

Многія вераць: калі пагладзіць і патрымаць на руках жывы сімвал года, то ўсе 365 дзён будуць шчаслівыя. Гладзіць тыгра ў заапарку забаронена па зразумелых прычынах. Але сфатаграфавацца з ім ніхто не забараняе. На свае вочы пабачыла, што гаспадары года — вялікія кошкі — у цэнтры ўвагі наведвальнікаў. Сэлфі, фота — абавязковы рытуал. На ўдачу ў новым годзе.

Крафтавая ёлка ў падарунак

Крэатыўна павіншавалі з годам Тыгра сваіх паласацікаў у Гродзенскім заапарку. Шархан і Тайга атрымалі ў падарунак крафтавую драўляную ёлку з мноствам «кашачых» забаўлялак. Шарыкі з шэрсці, заплечнікі, стары абутак, цацкі, пластыкавыя бутэлькі, мяса — на «дрэва» павесілі ўсё, што так любяць паласацікі. Тыгры — жывёлы надзвычай асцярожныя, таму знаёміліся з падарункамі паступова, адрываючы ад ёлачкі па адным сувеніры ў дзень.

У Мінскім заапарку жывуць тры паласацікі. Амурская тыгрыца Яраслава і два белыя бенгальскія тыгры — Сайман і яго сяброўка Тамуці.

Бачыла, як група школьнікаў стаяла каля клеткі з тыгрыцай і клікала Ярославу «кіс-кіс».

— На «кіс-кіс» гэтая кошка не адгукаецца, — усміхаецца **вядучы заатэхнік заапарка Аляўціна ЦІМАШКОВА-КРАСОЎСКАЯ.** — Выходзіць толькі, калі сама захоча зносін з людзьмі. У заапарк Яраслава прыехала з Пензы ў студзені 2019 года. Тады ёй было ўсяго сем месяцаў. Як толькі прывезлі, насцярожана ставілася да ўсіх. Практычна бязвылазна сядзела ў дамку, хавалася. Зараз амаль заўсёды ідзе на кантакт. Яна любіць увагу, нават часам рэагуе на зварот, рыкае ў адказ.

У прыродзе амурскія тыгры — найбуйнейшыя сярод усіх прадстаўнікоў сямейства каціных у свеце. Але паколькі самцы перабываюць па памерах самак, то ў сталічным заапарку самы вялікі кот — Сайман, з цёмнымі палоскамі на белым футры і блакітнымі вачыма. У дзікай прыродзе такому прыгажуну выжыць практычна нерэальна, бо ён вельмі прыкметны. Белы тыгр з'явіўся ў выніку генетычнай мутацыі. Гэта вельмі рэдкі від: частата з'яўлення — 1 асобіна на 10 тысяч з нармальнай афарбоўкай. Індыйцы верылі: таму, хто пабачыў белага паласаціка, будзе падаравана прасвятленне і поўнае шчасце.

— Сайману дзевяць гадоў. Ён спакойны і дабрадушны, любіць фатаграфавацца, дэфіліраваць уздоўж вальера як па подыуме, а таксама адпачываць у нішы штучнай скалы, радуючы наведвальнікаў сваім велічным выглядам, — распавядае Аляўціна Цімашкова-Красоўская. — Прыехаў у заапарк з Масквы вясной 2014-га. Праз чатыры з паловай года яму прывезлі сяброўку з Германіі.

Супрацоўнікі заапарка адказна паставіліся да падбору пары для свайго паласатага любімца. Дакладна праверылі радаслоўную прыгажуні, таму Сайману дасталася вельмі «радавітая» сяброўка. Тыгрыца Тамуці нарадзілася ў 2011 годзе, яе продкі — белыя бенгальскія тыгры з заапаркаў Германіі і Францыі. Нявеста для Саймана абышлася ў 10 тысяч еўра плюс дастаўка. А наогул кошт тыгра можа дасягаць і 30 тысяч еўра.

— Тамуці — поўная супрацьлегласць Саймана, — дзеліцца сваімі назіраннямі **Святлана РЭУТ, рабочая па доглядзе жывёлаў заапарка**. — Беласнежная арыстакратка не любіць увагі, больш за тое, усяляк яе пазбягае. Хаваецца ад чужых вачэй за каменем у вальеры. Сайман пару разоў спрабаваў прызнацца ёй у сваіх пачуццях. Але безвынікова. Пакуль, на жаль, бенгальская іскра не прабегла паміж белымі тыграмі.

Індыйцы вераць: чалавека, які пабачыў белага паласаціка, чакае прасвятленне і поўнае шчасце. На здымку — прыгажун Сайман.

Работнікі заапарка мараць пра тое, каб у Саймана і Тамуці з'явілася патомства, таму не страчваюць надзею. Праўда, складанасць яшчэ і ў тым, што тыгрыцы здольныя зачаць усяго 4-5 дзён у годзе.

БЕЗ ПАКЛОНУ НЕ ПАДЫДЗЕШ

— Як тыгры ў заапарку пераносяць зіму? — пацікавілася я.

— Мы горш, — смяецца Алена СІВАЯ, рабочая па доглядзе жывёл заапарка. — У іх футры натуральныя. Акрамя таго, у тыграў, акрамя вулічных вальераў, ёсць асобныя трохпакаёвыя апартаменты. Там нават падлога цёплая зроблена, каб жывёлы маглі паляжаць і пагрэцца.

— Тыгры па натуры адзіночкі, яны і ў прыродзе жывуць паасобку, — дадае Аляўціна Цімашкова-Красоўская. — Аб'ядноўваюцца ў пары ў прыродзе толькі для ўтварэння патомства.

Дарэчы, у наведвальнікаў ёсць магчымасць паназіраць, як тыгры ядуць. Супрацоўнікі заапарка часта ладзяць паказальныя кармленні. Паласацікі абажаюць ялавічыну на костцы. У іх рацыёне — выключна мяса без тлушчу, бо ён шкодны драпежнікам. Раз на тыдзень тыграм ладзяць разгрузачны дзень для прафілактыкі атлусцення. У гэты дзень ім даюць малако і яйкі.

Каб тыгры больш рухаліся, заатэхнікі прыдумваюць для іх розныя цацкі. Напрыклад, хаваюць мяса ў каробку альбо падвешваюць ядомы сюрпрыз на канат. Так тыгры, гуляючы, як быццам палююць на ежу.

— Для Яраславы зрабілі драўляную пляцоўку, якая была падвешаная як арэлі. Тыгрыца любіла там ляжаць і грызці мяса, — распавядае Аляўціна Цімашкова-Красоўская. — У выніку яна яе згрызла. Робім для тыграў басейны, усталёўваем свежыя пянёчкі, аб якія паласацікі з задавальненнем точаць кіпцюры. Яшчэ тыгры вельмі любяць камячыць вялікія пластыкавыя ёмістасці з-пад вады, падабаецца ім гэтае шорганне.

І яшчэ цікавае відовішча. На свае вочы бачыла, як сарокі-нахлебніцы праз шырокую рашотку зверху залятаюць у вальер да тыграцы і... смела ласуюцца рэшткамі ялавічыны. Пакуль птушкі дзяўбуць мяса, Тамуці іх не чапае.

— Вы не думайце, тыгрыца надзвычай каварная, — кажа Алена Сівая. — Гэта яна толькі выгляд робіць, што не заўважае сарок. А потым у адзін цудоўны дзень глядзіш — і кучка пер'яў у вальеры ляжыць.

Ёсць у заапарку і свая Марыяна (памятаеце папулярны фільм «Паласаты рэйс»?) — Наталля ВАСІЛЬЕВА, заатэхнік групы драпежных млекакормячых. Нягледзячы на сціпласць і стрыманасць, жанчына мае моцную волю. Таму нядзіўна, што тыгры яе слухаюцца. Наталля вучыць драпежнікаў, як правільна сябе паводзіць. Дзякуючы такім трэнінгам жывёла, напрыклад, разумее, калі трэба зайсці па камандзе ў кармавы адсек, каб яго можна было ізаляваць ад асноўнага вальера шыберам.

— Канкрэтнага часу заняткаў няма, каб жывёла не прывыкала, — кажа Наталля Васільева. — Складаней за ўсё мне было знайсці падыход да Тамуці. Тыгрыца прыехала з еўрапейскага заапарка, дарослая, палаваспелая, са сваімі звычкамі, устоямі. Дагэтуль яна ніколі не чула нашай мовы. У яе быў вельмі цяжкі перыяд адаптацыі, доўга прывыкала да ўсяго новага. Калі шчыра, мне з ільвамі прасцей дамовіцца. Яны жывёлы сацыяльныя, з людзьмі лягчэй ідуць на кантакт. А тыгр... Калі ў яго ёсць настрой, прыйдзе і будзе працаваць, кантактаваць. Калі ж няма — без паклону не падыходзь. Недарэмна палоскі на лбе тыгра нагадваюць кітайскі іерогліф «кароль».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

А вы ведалі, што...

✓ ...палосы ў тыграў ёсць не толькі на поўсці, але і на скуры. Калі драпежніка цалкам пагаліць, новая поўсць адрасце дакладна з тым жа ўзорам, што быў раней. Прычым паласаты малюнак у кожнага тыгра ўнікальны, як адбіткі пальца чалавека;

✓ ...усе без выключэння віды тыграў занесены ў Чырвоную кнігу, паляванне на іх забаронена ва ўсім свеце;

✓ ...тыгры ўмеюць імітаваць галасы некаторых іншых жывёл, у прыватнасці мядзведзяў і леапардаў. Гэтую здольнасць драпежнікі выкарыстоўваюць, каб завабіць ахвяру ў пастку. Рык тыгра можа на некалькі секунд паралізаваць здабычу;

✓ ...у некаторых раёнах Індыі людзі, ідучы ў лес, надзяваюць на патыліцу маску ў выглядзе твару чалавека. Лічыцца, што гэта дапамагае засцерагчыся ад нападзення тыгра, бо той робіць гэта толькі з засады і ззаду.

Дзе яшчэ можна сустрэцца з сімвалам года?

✓ У станькаўскім Цэнтры экатурызму жывуць амурскія тыгры — Губерт і Хельга.

✓ У кантактным заапарку ў аграсядзібе «Графская спадчына» (вёска Падгай) — амурскія тыгры Амурка і Цімур.

✓ У гродзенскім заапарку — амурскія тыгры Шархан і Тайга.

✓ Бенгальскіх тыграў можна пабачыць толькі ў сталічных заапарку і цырку. Праўда, дрэсіроўшчык Сяргей Несцераў са сваімі белымі паласацікамі (Піліпам, Заірам, Верай, Надзеяй і Любоўю) зараз знаходзіцца на гастролях у Маскве.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91»

ЛОТ № 1:

АДМИНИСТРАТИВНОЕ ПОМЕЩЕНИЕ

с инв. № 500/D-708004811, 39,9 кв. м,
адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 7.

Изолированное помещение расположено в капитальном строении, которое является памятником историко-культурного наследия.

Начальная цена с НДС – 198 199,12 бел. руб.

Задаток – 19 819,91 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион состоится 18.02.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 16.02.2022 в 11.00.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОАО «Берестовицкая ПМК № 141»** (УНП 500020631), объявляет о проведении **18.02.2022 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/01/spisok-imushhestva-berestovickaya-pmk_torgi_18_02_2022.pdf

Местонахождение имущества: Гродненская область, Берестовицкий район, г. п. Большая Берестовица, пер. Советский, д. 7.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «Берестовицкая ПМК № 141», тел. +375293923903.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **17.02.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 01.02.22** по **17.00 17.02.22** на bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор по лотам недвижимости – **2 %** от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в соответствии с договором купли-продажи.

В **суд Лельчицкого района Гомельской области** поступило заявление об объявлении умершим ГАПАНОВИЧА Алексея Степановича, 23 июля 1962 года рождения, уроженца д. Глушковичи Лельчицкого района Гомельской области, последнее известное место жительства и пребывания: Гомельская область, д. Глушковичи, ул. Советская, д. 98.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Гапановиче Алексее Степановиче сообщить об этом в двухмесячный срок с момента публикации данного сообщения в суд Лельчицкого района Гомельской области по адресу: 247841, Гомельская область, г. п. Лельчицы, ул. Ленина, 3, тел. 8 (02356) 21256, e-mail: lelchitsi@court.by.

Свидетельство о государственной регистрации ИП ЛАЗАРЕНКО Рустам Рустамович (УНП 192544209), выданное исполнительным комитетом Фрунзенского района г. Минска, **считать недействительным в связи с утерей.**

01.02.2022 года в издательском доме «Звязда» опубликована проектная декларация на строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки)

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ № 3

НА СТРОИТЕЛЬСТВО ОБЪЕКТА:

««Строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки)». II очередь строительства. Индивидуальные жилые дома, КПП, ограждение территории. II пусковой комплекс.».

Информация о застройщике:

Застройщик: Производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 08 ноября 2000 года № 1266, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100011299.

Юридический (почтовый) адрес: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 100-817.

Режим работы для приема заявлений и заключения договоров: Понедельник–пятница с 9.00 до 18.00.

Производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» в качестве заказчика построило следующие объекты:
- Бизнес-центр Покровский, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, нежилой фонд,
- Многоквартирный жилой дом г. Минск, ул. К. Чорного, д. 25, жилой фонд,
- Санаторно-курортный комплекс «Плисса», Витебская область, Глубокский район, деревня Плиса, улица Гвардейская, дом 4, нежилой фонд.

Перечень объектов, построенных за последних три года:
- Храм-памятник в честь Всех Святых, г. Минск, ул. Калиновского, 121, нежилой фонд.

Информация о проекте:

Проектно-сметная документация прошла государственную экспертизу в установленном порядке, получено положительное заключение РУП «Госстройэкспертиза по Минской области» от 28.10.2020 г. № 1635-70/20.

Проектная документация разработана на основании разрешительной документации в составе:
- акт выбора места размещения земельного участка, предоставленного в постоянное пользование, утвержденного от 07.10.2019 г.;
- решение Смолевичского районного исполнительного комитета «О разрешении производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» строительства объекта» от 17.11.2020 г. № 2971;
- решение Смолевичского районного исполнительного комитета «О разрешении производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» строительства объекта» от 18.05.2021 г. № 1279.

Участок площадью 12,8621 га передан производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» на основании договора аренды земельного участка от 22.11.2019 г. № 2272 для строительства жилого микрорайона. Свидетельство (удостоверение) от 02.12.2019 № 614/828-15837 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 624850100008000760.

Застройщиком по строительству объекта выступает производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ».

Функции подрядчика индивидуального жилого дома исполняет:
по генплану № 40 (тип 4): ПС ЗАО «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ»;
Местонахождение объекта: в микрорайоне Липки г. Смолевичи.
Цель строительства: возведение индивидуальных жилых домов.
Этапы и сроки строительства:
- срок начала строительства объекта – I квартал 2022 г.;
- окончание строительства объекта – I квартал 2023 г.

Характеристика объекта: строительным проектом предусмотрено строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи Минской область (микрорайон Липки) в количестве 85 индивидуальных жилых домов.

Общая площадь одноквартирного жилого дома по генплану № 40 (тип 2.1) составляет 141,41 кв. м, состоящего из 4 (четырех) жилых комнат, общей площадью 95,49 кв. м. В доме 1-й этаж.

Строительство объектов долевого строительства будет осуществляться в соответствии со строительным проектом и заключенными договорами создания объектов долевого строительства.

По настоящей проектной декларации для категории граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц предлагаются для заключения договоров создания объектов долевого строительства следующие объекты долевого строительства:

Индивидуальный жилой дом, № по генплану	Стоимость 1 м², бел. руб.
№ 40 (тип 2.1)	2 528,23

- на индивидуальный жилой дом по генплану № 40,

Для лиц, заключивших договоры создания объекта долевого строительства, цена 1 кв. м, определенная в договоре, является неизменной до окончания строительства. Плата за объект долевого строительства производится дольщиком в соответствии с графиком платежей.

По согласованию сторон допускается изменение порядка расчета по оплате объекта долевого строительства с заключением дополнительного соглашения к договору.

Состав общего имущества: внутриквартальная автодорога, тротуары, сети, освещение, внутриплощадочные сети, электро-, газо- и водоснабжение, канализация, элементы благоустройства.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по его строительству можно получить по адресу: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 100-817 или по тел.; +375 29 390-01-01.

Принятие и регистрация заявлений осуществляется с первого дня с даты публикации настоящей проектной декларации. Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

По истечении 7 дней с даты публикации настоящей проектной декларации и до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству задекларированных индивидуальных жилых домов, производится заключение договоров долевого строительства. Для заключения необходимо личное присутствие дольщика и его паспорт.

Если гражданин, либо иной претендент на участие в долевом строительстве, в течение 7 (семь) рабочих дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

Генеральный директор **В. М. Николаевич**
Главный бухгалтер **О. В. Асаевич**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» ***(Организатор аукциона)*** **по поручению открытого акционерного общества «Стародорожский райагросервис»** ***(Продавец)*** **проводит открытый аукцион по продаже**

ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ с инв. № 645/D-4675

(наименование – административное помещение с 2-мя пристройками (3, 4), общей площадью 58,4 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Советская, 12А-1. Сведения о земельном участке: кадастровый номер 625250100024000052 *(право аренды по 02.11.2116)*, **площадь 0,1373 га, адрес земельного участка: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Советская, 12А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **11 199,46** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 119,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **04.03.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.03.2022** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.
Тел. для осмотра: 8 (029) 167 14 90, 8 (01792) 38 5 76.

УНП 600026692

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Юрковичи» (продавец) проводит открытый аукцион
